# песні роднага краю



# песні роднага краю

## СПЕЎНІК



ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ» МІНСК 1972

783
Р 60

*Склалі Г. Цітовіч і*
*Л. Траскоўская*

9-4-6
334-72

## ПЕСНЮ БЯРЫЦЕ З САБОЮ!

Песня — своеасаблівы летапіс народа, што парадзіў яе,— адлюстраванне яго светапогляду і характару, думак і надзей, эстэтычнага густу і адносін да наваколля.

З вялікай павагай ставіліся да песеннай творчасці выдатныя грамадскія дзеячы і асветнікі, музыканты і пісьменнікі, філолагі і гісторыкі.

А колькі пранікнёных і ўзнёслых вершаў прысвяціў роднай песні наш вялікі Купала! Мудрым запаветам гучаць сёння для нашчадкаў яго цудоўныя радкі:

> Песні, знайце,— сэрца дар,
> Шанаваць іх трэба.

Усе мы любім добрую песню, любім яе па-

спяваць і паслухаць. Яна яднае людзей, будзіць у іх узвышаныя пачуцці.

І на святочнай дэманстрацыі, і на сустрэчах ветэранаў-партызан, і ля турысцкага вогнішча, і за бяседным сталом без песні не абысціся...

Пачынальнік знойдзецца заўсёды, а за ім папулярную песню падхопяць астатнія. Стыхійна ўзнікае шматгалосы хор... Але даволі часта даводзілася быць сведкам таго, як пасля першага-другога куплета гэты хор паволі пачынае раставаць і нарэшце нікне, бо не ўсе ведаюць словы песні, а часам недакладна інтануюць і яе мелодыю.

Спеўнік, які мы прапануем вам, аматарам роднай песні, павінен у такіх выпадках дапамагчы... Хочацца думаць, што ў вас дома ён знойдзе сабе належнае месца; не забудзьце браць яго з сабой і ў дарогу.

І тут мімаволі нагадваюцца шчырыя і разумныя радкі Ніла Гілевіча, якія ён калісьці напісаў нібы ўступам да гэтага зборніка:

Калі не жадаеце знацца ў жыцці
З назойлівай скрухай-журбою,—
Куды б ні прыйшлося паехаць, пайсці,—
Песню бярыце з сабою!

Ці клікне вас мора туманная даль
Нямоўкнучым гулам прыбою,—
Пакіньце на беразе смутак і жаль!
Песню бярыце з сабою!

Ці, можа, дарога лягла праз тайгу,
Нязведанай нетрай глухою,—
Выкіньце з ранцаў і сэрцаў тугу!
Песню бярыце з сабою!

Калі вы друг другу руку падалі,
Каб крочыць дарогай адною,—
Забудзьце, што гнездзіцца сум на зямлі,—
Песню бярыце з сабою!

Калі ж над радзімай прамчацца вятры —
Прадвеснікі блізкага бою,—
З вінтоўкай, з гранатаю разам, сябры,
Песню бярыце з сабою!

У зборніку — песні традыцыйныя і сучасныя, творы здольных песняроў-аматараў, вядомых кампазітараў, паэтаў і папулярныя народныя песні. Апрача ўрачыстых, масавых ёсць тут і песні на штодзень,— для індывідуальнага і ансамблевага выканання: для маці, якая схіляецца над калыскай свайго дзіцяці, для хлопца або дзяўчыны, для шчаслівай закаханай пары, для ўсіх тых, хто любіць паспяваць у хвіліны адпачынку.

Большасць песень зборніка вядома ўсёй Беларусі, а асобныя, крылатыя, прызямліліся далёка за межамі нашай рэспублікі. Ёсць тут і некалькі песень, якія дагэтуль былі здабыткам толькі абмежаваных раёнаў або паасобных калектываў, але, на нашу думку, яны заслугоўваюць большай увагі.

Шмат цудоўных песень на Беларусі!

Мы сабралі тут лепшае з таго, што любяць слухачы і выканаўцы.

Дык няхай жа родная песня ўпрыгожвае ваша жыццё, няхай жа сардэчна і звонка гучыць яна і на святочным застоллі, і ва ўрачыстым шэсці, і ў штодзённым побыце, бо, як кажа наша народная прымаўка, «хто з песняю дружыць — той ніколі не тужыць».

*Г. ЦІТОВІЧ*

# I

# ДЗЯРЖАЎНЫ ГІМН БЕЛАРУСКАЙ ССР




Пар – ты– я к шчас–цю вя – дзе нас ў па–
f
–ход. Пар– ты– і сла – ва! Сла– ва Ра–
–дзі – ме! Сла – ва та – бе, бе – ла–
ff
–рус– кі на – род! Пар– ты– і сла – ва!
Сла – ва Ра– дзі – ме! Сла– ва та– бе, бе–ла–
1.2.
3.
–рус – кі на – род! //–рус– кі на – род!

Мы — беларусы з братняю Руссю
Разам шукалі к шчасцю дарог,
Ў бітвах за волю, ў бітвах за долю
З ёй здабылі мы сцяг перамог!

Нас аб'яднала Леніна імя,
Партыя к шчасцю вядзе нас ў паход.
Партыі слава! Слава Радзіме!
Слава табе, беларускі народ!

Сілы гартуе люд Беларусі
Ў братнім саюзе, ў мужнай сям'і.
Вечна мы будзем, вольныя людзі,
Жыць на шчаслівай, вольнай зямлі!

Нас аб'яднала Леніна імя,
Партыя к шчасцю вядзе нас ў паход.
Партыі слава! Слава Радзіме!
Слава табе, наш свабодны народ!

Дружба народаў — сіла народаў,
К шчасцю працоўных сонечны шлях.
Горда ж узвіся ў светлае высі,
Сцяг камунізма — радасці сцяг!

Нас аб'яднала Леніна імя,
Партыя к шчасцю вядзе нас ў паход.
Партыі слава! Слава Радзіме!
Слава табе, наш савецкі народ!

# ПАРТЫІІ СЛАВА

*Словы А. Астапенкі* *Музыка І. Кузняцова*






Маці-Радзіма заззяла красою
Ў росквіце сёл, гарадоў.
Партыю славім за шчасце людское,
Ёй — нашы думы, любоў.

Прыпеў:

Партыя — наша сіла і слава,
Партыя — мары ўзлёт,
Партыя — розум, сумленне дзяржавы,
З Партыяй крочыць народ.

Пройдзем за Партыяй яснай дарогай,
Верым, як праўдзе, мы ёй.
Шчодра памножым свае перамогі
Мужнай з'яднанай сям'ёй.

Прыпеў.

Вечна за мір мы стаім у дазоры,
Хораша жыць і тварыць.
Радасць, святло абдымаюць прасторы,
Песня над краем звініць.

Прыпеў.

# ОН РОДИЛСЯ ВЕСНОЙ

*Слова А. Чепурова* *Музыка И. Лученка*




жизнь расцве_ла, как вес_на.
3. Смот_рит прис_таль_но вдаль
наш у_чи_тель и друг, вся зем_
_ля про_бу_ди_лась от сна.
Он ро_дил_ся вес_ной,
cresc.
и бу_шу_ет во_круг на_шей
sub. p
жиз_ни боль_ша_я вес_на, на_шей
cresc.
f
жиз_ни боль_ша_я вес_на,




Он родился весной...
Пробуждались поля
От глубокого зимнего сна.
Он родился весной, чтоб не только земля,
Чтобы жизнь расцвела, как весна.

С ним встречаем грозу,
Делим радости с ним,
Называем любимым отцом,
Верным другом своим,
Самым мудрым, родным
Или просто зовем Ильичем.

Смотрит пристально вдаль
Наш учитель и друг,
Вся земля пробудилась от сна.
Он родился весной, и бушует вокруг
Нашей жизни большая весна!

# РАДЗІМА МАЯ ДАРАГАЯ

*Словы А. Бачылы* — *Музыка У. Алоўнікава*






Радзіма мая дарагая,
Ты ў шчасці жаданым жыві.
Я сэрцам табе прысягаю
У шчырай сыноўняй любві.
На рэках шырокіх і нівах,
Заводах, будоўлях — наўсцяж
Народ наш працуе руплівы
І край узвышаецца наш.

Навокал жыццё расцвітае
І песня ўзлятае сама:
Мне лепей ад роднага краю
Нічога на свеце няма.
Чужое зямлі нам не трэба,
Пачуцці ў нас сёння адны:
Мы хочам, каб мірнае неба
Не знала пажараў вайны.

Мы дружбы народам жадаем
І шчырай братэрскай любві.
Радзіма мая дарагая,
Красуйся і ў шчасці жыві!

# СЛАВІМ МЫ СВОЙ КРАЙ ЛЮБІМЫ

*Словы П. Броўкі* *Музыка Ю. Семянякі*




2 Зак. 998




Славім мы свой край любімы —
Поле, луг, сваю зару,
Як ты сэрцу майму міла,
Дарагая Беларусь.
Залацістыя прасторы,
Міліёны ясных зор,
Рэкі ціхія, азёры,
Галасісты, шумны бор.

Ты нас ласкай атуліла,
І я ў шчасці гавару:
Як ты сэрцу майму міла,
Дарагая Беларусь.
Не магло нам і прысніцца,
Як ты, родная, жыла.
Паглядзі, твая сталіца,
Нібы казка, расцвіла.

Славім мы свой край любімы —
Поле, луг, сваю зару.
Як ты сэрцу майму міла,
Дарагая Беларусь.

# ОЙ, ШУМІ ТЫ, РАДУЙСЯ

*Словы П. Броўкі* — *Музыка В. Яфімава*




Ой, шумі ты, радуйся,
Беларускі бор,
Узлятай ты, песенька,
Да высокіх зор.

Праляці над гоманам
Спелых каласоў,
Праляці над плошчамі
Шумных гарадоў.

Над Масквой-сталіцаю
Сокалам кружы,
Ты братам-таварышам,
Родная, скажы,

Што шчасліва, радасна
Беларусь жыве,
Што Маскве сардэчнае
Прывітанне шле.

Ой, шумі ты, радуйся,
Беларускі бор.
Узлятай ты, песенька,
Да высокіх зор.

# НЁМАН

*Словы А. Астрэйкі* *Музыка Н. Сакалоўскага*



Ой, Нёман, і песня і слава
Народа майго і зямлі,
Магілаю ворагам цеснай
Не раз твае хвалі былі.

Рака наша слаўная Нёман,
Чысцейшая чэрвеньскіх рос,
Хто мар не ўплятаў у твой гоман,
Табе хто пашаны не нёс.

Ой, Нёман, ой, бацька наш родны,
Як сонца, як дзень дарагі,
Садамі цудоўнай Радзімы
Твае расцвілі берагі.

# ЖУРАЎЛІ НА ПАЛЕССЕ ЛЯЦЯЦЬ

*Словы А. Ставера* *Музыка І. Лучанка*




2
_днё_ вы_я, што ім зе_ лень пла_та_наў і
айв, ка_лі клі _ чуць іх да_ лі сас_
_но_ вы_ я і а _ зёр _ ны ра_ бі_ на _ вы
1.
2.
край! //_цяць...
3
Жу _ раў _ лі ля _ цяць.

Каб любіць Беларусь нашу мілую,
Трэба ў розных краях пабываць.
Разумею цяпер, чаму з выраю
Жураўлі на Палессе ляцяць.

Што ім тыя пагоды паўднёвыя,
Што ім зелень платанаў і айв,
Калі клічуць іх далі сасновыя
І азёрны рабінавы край!

Сакавітыя пожні мурожныя
Не заменіш нічым і нідзе
І зямлю, дзе сцяжыначка кожная
У прыветлівы двор прывядзе.

Каб любіць Беларусь нашу мілую,
Трэба ў розных краях пабываць.
Разумею цяпер, чаму з выраю
Жураўлі на Палессе ляцяць,
Жураўлі ляцяць...

# ПЕСНЯ О МИНСКЕ

*Слова И. Панкевича* *Музыка В. Оловникова*




f p
_ща_ю, мой го_род, мой го_род, мой
f
го _ род ге_рой- пат_ри _ от!
ПРИПЕВ:
mf
Пусть взле_та_ет пес_ня пти_цей над ро-
cresc.
_ ди _ мой сто_ ро _ ной те_
_бе, мо_я сто_ ли _ ца Бе_ ло_




Широким проспектом шагаю,
И сердце от счастья поет.
Я песню тебе посвящаю,
Мой город герой-патриот.

Припев:

Пусть взлетает песня птицей
Над родимой стороной
О тебе, моя столица
Белоруссии родной.

Повсюду счастливые лица
Встречаются мне на пути.
Ну как мне, друзья, не гордиться?
Ну как же без песни идти?

Припев.

И парки твои, и бульвары
Люблю я вечерней порой,
Близки мне влюбленные пары
И шелест листвы молодой.

Припев.

Тобою горжусь я по праву,
И радостно мне от того,
Что в этой красе величавой
Есть доля труда моего.

Припев.

# КАМСАМОЛЬСКАЯ ПЕСНЯ

*Словы А. Дзеружынскага* *Музыка Д. Камінскага*






Новы ранак заняўся над намі,
Сонца шчасця над намі ўзышло.
Над заводамі мы, над палямі
Запалілі навекі святло.

Прыпеў:

З камсамольскаю песняй
Мы ідзём па любімай краіне.
Мы ідзём к камунізму няспынна —
Ў гэты слаўны, вялікі паход!

Па пуцёўках ідзём камсамола
Славіць край працай дружнай сваёй.
Вырастаюць палацы і школы,
Паўстаюць гарады над зямлёй.

Прыпеў.

Служым партыі нашай сумленна
Усім сэрцам сваім маладым.
Запаветы твае, мудры Ленін,
Кожны споўніць гатовы заўжды.

Прыпеў.

# ЛЯСНАЯ ПЕСНЯ

*Словы А. Русака* *Музыка У. Алоўнікава*



2

Ой, бярозы ды сосны —
Партызанскія сёстры,
Ой, шумлівы ты, лес малады!
Толькі сэрцам пачую
Тваю песню лясную
Ды успомню былыя гады.

Ды успомню пажары,
І варожыя хмары,
І завеі халодных вятроў,
І слату, і нягоды,
І начныя паходы,
І агні партызанскіх кастроў.

Край любімы мой, родны,
Ты навекі свабодны,
За цябе я на бітву хадзіў,
Каб ніколі, ніколі
Ты не быў у няволі,
Каб заўсёды у шчасці ты жыў.

Адышлі тыя годы,
Адгрымелі паходы,
Толькі пушча за полем шуміць.
Ой, бярозы ды сосны —
Партызанскія сёстры,
Вас ніколі ў жыцці не забыць...

3 Зак. 998

# ПАРТЫЗАНСКІ КРАЙ

*Словы А. Дзержынскага* *Музыка І. Кузняцова*






Дарога сцелецца абрусам,
Азёры, рэчкі, лес і гай.
Ляжаць прасторы Беларусі —
Мой гераічны слаўны край.

Прыпеў:

Слаўся, родная мая,
Слаўся, расцвітай,
Беларуская зямля —
Партызанскі край!

Лясныя сцежкі і паляны
Вядуць размову тут са мной.
Не раз героі-партызаны
На ворага хадзілі ў бой.

Прыпеў.

Бягуць дарогай самазвалы
І будзяць раннюю зару.
Ты, як вясна, закрасавала,
Мая краіна — Беларусь!

Прыпеў.

# ОБЕЛИСКИ

*Слова М. Ясеня* — *Музыка Д. Смольского*




Пред ни_ми вы го_ло_вы низ_ко скло_ни_те.
Лю_ди! Мол_ча_ньем вы
свет_лу_ю па_мять по_чти_те тех, кто
на_смерть стоял, кто нам жизнь от_стоял, кто нам
1.
мир на зем_ле за_ве_щал.
2.
мир на зем_ле за_ве_щал.
rit.
Там, где да_ле_ко над ни_ми ко_лы_шут_ся




Серые камни, свинцово тяжелые камни,
Русскому сердцу как много они говорят.
Где-то далеко над ними колышутся пальмы,
Где-то березы шумят.
В сопках Маньчжурских,
В норвежских фиордах скалистых,
В море, на суше советские воины спят.
В Минске и Риме, в Софии, Варшаве, Париже
Их обелиски стоят.
Люди!
Пред ними вы головы низко склоните,
Люди!
Молчаньем вы светлую память почтите
Тех, кто насмерть стоял,
Кто нам жизнь отстоял,
Кто нам мир на земле завещал.

К тем обелискам приходит увидеть мать
сына,
Шустрый парнишка приходит послушать отца.
Зримо и близко невесту там встретит
любимый:
Камни — живые сердца.
Мир будет помнить вас, гордые, смелые люди,
Мир не забудет России отважных солдат.

Там, где далеко над ними колышутся пальмы,
Там, где березы шумят.
Люди!
Пред ними вы головы низко склоните,
Люди!
Молчаньем вы светлую память почтите
Тех, кто насмерть стоял,
Кто нам жизнь отстоял,
Кто нам мир на земле завещал.

# ШАГАЛИ СОЛДАТЫ

*Слова С. Евсеевой* *Музыка Г. Вагнера*






Шагали солдаты весь день напролет
И вот добрались до привала.
И плещется речка, и песню поет
Совсем молодой запевала.
И слушает молча
Полковник седой,
Как старая песня летит над водой,
Знакомая песня
О девушке той,
Что выходила на берег крутой.
Ждала пограничника верно она,
Ему посылала приветы.
В пехотную форму одела война
Веселую девушку эту.
И дым над рекою
Клубился густой,
Клубился над жизнью ее молодой.
Сражалась Катюша —
Солдат рядовой,
За наш высокий за берег крутой.
Ушел за пригорок отчаянный бой,
Разрывы все дальше и глуше,
И ветер кружил над сожженной травой,
И не было больше Катюши.
Катюша, Катюша, туман над рекой,

Сады без тебя расцветают весной.
Тебя вспоминаем у речки у той,
Где выходила на берег крутой.
А песня умолкла, и лагерь затих,
Вповалку заснули солдаты.
А тот, кто постарше любого из них,
Не спит, как весною когда-то.
И слушает молча полковник седой,
Как шепчутся вечные сосны с водой
О девушке милой, о девушке той,
Что выходила на берег крутой.

# ПЕСНЯ ПРА ЗАСЛОНАВА

*Словы А. Астрэйкі* *Музыка У. Алоўнікава*



Як узыдзе сонца сінім раннем веснім,
Як развее над зямлёй туман,
Над краінай пралятае песня, } 2 р.
Песня баявая партызан.

І звіняць, гудуць на ўсю нашу дзяржаву
Гарадоў і вёсак галасы —
Канстанцін Заслонаў — наша слава, } 2 р.
Беларусі-партызанкі сын.

У сцягах Радзімы яркім промнем ззяе
Над усёй савецкаю зямлёй
Доля твая, справа баявая, } 2 р.
Мужны, легендарны наш герой.

Як узыдзе сонца сінім раннем веснім,
Як развее над зямлёй туман,
Над краінай пралятае песня, } 2 р.
Песня баявая партызан.

# НАД ПРЫПЯЦЦЮ

*Словы А. Русака* *Музыка Я. Цікоцкага*






То не мора сіняе хвалямі раве,—
Па шырокай Прыпяці параход плыве.
Да крутога берага, дзе кусты шумяць,
Дзеўчына каханага выйшла сустракаць.

І танкіста дзеўчына шчыра абняла,
Да сяла да роднага сцежкай павяла.
Іх віталі шумныя родныя палі,
Кланялася ніва ім нізка да зямлі.

Скіне неба пробліскі ранішняй зары,
Павядуць ізноў яны ў поле трактары.
І вясенняй песняю адгукнецца гай,
Ой, старонка родная — наш палескі край!

# УЗНЯЛОСЯ СОНЦА ЯСНАЕ

*Словы А. Русака* *Музыка Д. Лукаса*






Узнялося сонца яснае
Над палямі, над азёрамі
І да шчасця ўсе дарожанькі
Асвяціла над прасторамі. } 2 р.

З трох старон па трох дарожаньках
Выйшлі людзі светлай раніцай
На Дрысвяцкае на возера —
Будаваць электрастанцыю. } 2 р.

Закіпела праца дружная,
Дзе палеткі залацістыя,
Зашумелі, закружыліся
У турбінах воды быстрыя. } 2 р.

І у хатах светлай радасцю
Ясны зоры засвяцiліся,
Да Масквы з падзякай шчыраю
Дружна песня пакацілася. } 2 р.

Пралятае песня птушкаю,
Пралятае над старонкаю,
Беларусь, Літву і Латвію
Акрыляе славай звонкаю. } 2 р.

Праслаўляе працу дружную,
Працу мірную, свабодную,
Сілу іх усемагутную,
Дружбу іх усенародную. } 2 р.

# РАДАСЦЬ

*Словы Я. Коласа* *Музыка А. Туранкова*






Ходзіць вецер па даліне,
Ходзіць-павявае
Ды пра радасць мне, дзяўчыне,
Песні напявае.
Разаслаліся шырока
Ветлыя дарогі,
Я ступаю смелым крокам
Без тугі, трывогі.
Выйду, гляну я на поле,
Гляну — усміхнуся:
Дзе ж такое ёсць раздолле
Для цябе, Ганнуся?

Зняты межы — знак варожы,
Гмахі — задзівіцца!
Ой ты, поле! Як прыгожа
Ты ў калгаснай світцы.

Ходзіць вецер даліною,
Ходзіць каля гаю.
І я вольнай пуціною
Іду, дзе жадаю.
Расчынілі мне гасцінна
Ясныя дарогі —
Ідзі ўперад несупынна:
Зняты ўсе парогі.

Я — камбайнер, трактарыстка,
Кіраўнік брыгады.
Я — пілот, парашутыстка,
І мне ўсюды рады.
Я — дырэктар на заводзе,
Аграном, вучоны.
Ці было калі ў народзе
Столькі нам разгону?
Носіць поле гоман новы,
Жыта жнуць жняяркі,
Рэжа скібы вол сталёвы
Бальшавіцкай маркі.

І гамоняць нашы нівы
Буйным ураджаем.
Ходзіць ён, дружок зычлівы,
Па савецкім краі!
Ходзіць вецер па даліне,
Ходзіць-павявае
Ды пра радасць мне, дзяўчыне,
Песні напявае.

Дзе ж так вольна ў свеце жыці?
Ці ж не радасць гэта?
Як жа край свой не любіці,
Родны Край Саветаў!

# ОЙ, ШУМЯТ ЛЕСА ЗЕЛЕНЫЕ

*Слова А. Ситковского* *Музыка Ю. Семеняко*



Ой, шумят леса зеленые,
Реки быстрые текут,
Над дубками да над кленами
Облака летят-плывут.
Гармонист погожим вечером
Нежно трогает лады —
И гармонь, и голос девичий
Славят реки и сады.

Не страшны ветры жестокие
Золотым, родным полям.
И стоят хлеба высокие,
Низко кланяясь лесам.
От воды несет прохладою,
Пахнут медом ветерки,
Провода за палисадами
Зажигают огоньки.

Ой, шумят леса зеленые,
Реки быстрые текут,
Над дубками да над кленами
Облака летят-плывут.
Ты расти, цвети над нивами
Молодых лесов стена.
Ты расти, цвети, счастливая
Наша мирная страна.

# КОЛАС

*Словы А. Ставера* *Музыка М. Чуркіна*



За сяло ў прыволле
Выйду раніцой,
Дзе жытное поле
Свеціцца расой.
Запяю любімай
Песенькі матыў:
Колас, ты мой колас,
Колас залаты.

Радасны, шырокі
Мой жыццёвы шлях,
З мілым сінявокім
Тут гуляю я.
Добры ён — не знойдзеш
Гэткай дабраты.
Колас, ты мой колас,
Колас залаты.

Каб не паўстрачацца,
Дня не праміне.
Пазаўчора з танцаў
Ён правёў мяне
І сказаў — прыедзе
Да мяне ў сваты.
Колас, ты мой колас,
Колас залаты.

Быстры ручаёчак
Па лугу цячэ...
Пачакай, дружочак,

Хоць гадок яшчэ:
Малада я вельмі,
Сам жа знаеш ты.
Колас, ты мой колас,
Колас залаты.

# ЗУБРЕНОК

*Слова А. Миронова* *Музыка П. Подковырова*






Этажами над лесом вздымаясь,
Встал за Минском гигантский завод,
И выходит, окраской сверкая,
Грузовик из заводских ворот.

Припев:

Гул мотора чудесен и звонок,
Путь извилист, далек, ой, далек,
И бежит остророгий зубренок
По асфальту широких дорог.

Комсомолка рулем управляет,
Перед ней вся отчизна лежит,
Над мотором эмблема сияет —
Остророгий зубренок бежит.

Припев.

Провожает машину с задором
Паренек, хоть ему не легко:
Он остался, а сердце с шофером
Унеслось далеко, далеко.

Припев.

Он уверенно знает — недаром
Создавался могучий мотор;
Завтра новый чудесный подарок
Здесь получит веселый шофер.

Припев.

По широким дорогам и узким,
Словно ветер, зубренок летит.
Слава нашей земле белорусской!
Слава людям советской земли!

Припев.

# ВЕЧАРЫНКА У КАЛГАСЕ

*Словы Я. Купалы* *Музыка С. Палонскага*






Вечарынка у калгасе,
У «Чырвоным Аратаю»,—
Прыйшлі Сцёпкі, Пецькі, Васі,
Прыйшлі Зосі, Стасі, Касі,
  І гармонік грае, грае...

Прыйшлі з поля, з гаспадаркі,
Клуб запоўніўшы да краю,
Брыгадзіры і даяркі,
Брыгадзіркі і свінаркі,
  І гармонік грае, грае...

Ходам ходзяць гаспадыні —
Маладыя і старыя,—
Зіна шэпча штось Мальвіне,
А Мальвіна шэпча Зіне,
  І гармонік грае, грае...

Захапіўшы ў першай пары
Янка Маньку, Юрка Раю,
Даюць дыхту, даюць жару,
«Сербіянку», польку шпарацы,
  І гармонік грае, грае...

За сталом ідзе бяседа
Аб жыцці, аб ураджаі,
П'е суседка да суседа,
Хто не снедаў, тут даснедаў,
І гармонік грае, грае...

Ночка сходзіць, сонца ўсходзіць,
І дамоў было б пара ім,
А скакаць яшчэ не годзе,
Яшчэ танцы на расходзе,
А гармонік грае, грае...

# ХОДЯТ ПЕСНИ НАД РЕКОЮ

*Слова В. Семакина* *Музыка И. Кузнецова*




5 Зак. 998

Тронешь веточку рукою —
След росы на рукаве.
Ходят песни над рекою —
Не одна, а сразу две.
Каждый кустик серебрится,
А река как будто спит.
Чья-то юность веселится,
Чья-то молодость грустит.

Кто-то милую ласкает,
Кто-то к милой не идет.
Песня за сердце хватает,
Песня за душу берет.
Не до сна, не до покоя
Ни березкам, ни траве.
Ходят песни над рекою —
Не одна, а сразу две.

Ходят песни берегами,
Одинаково близки,
Словно льются над лугами
Две серебряных реки.
И как будто сумрак тает,
Замирают камыши.
Песня песне не мешает,
Если обе от души.

# ГДЕ-ТО В ПОСЕЛКЕ

*Слова К. Гляйхенгауса* *Музыка В. Оловникова*






Ветки сирени стучат мне в окошко,
Долго уснуть не дают.
Где-то в поселке играет гармошка,
Девушки песни поют.
Песни поют, песни поют,
Девушки песни поют.

Майская зорька на небе алеет,
Сосны обнявшись стоят.
Может быть, там, по тенистым аллеям,
Ходит подружка моя.
Ходит подружка, ходит подружка,
Ходит подружка моя.

Серпик луны серебрит ей дорогу,
Ноги полощет роса.
Чем я ее огорчил, недотрогу,
Что не по сердцу сказал?
Что не по сердцу, что не по сердцу,
Что не по сердцу сказал?

Ветки сирени стучат мне в окошко,
Спать до утра не дают.
Где-то в поселке играет гармошка,
Девушки песни поют.
Песни поют, песни поют,
Девушки песни поют.

# КАЛГАСНЫ ВАЛЬС

*Словы А. Русака* *Музыка Г. Цітовіча*






Гаснуць у хатах агні залатыя,
Цені начныя на палі паляглі.
Сцелюцца ў лузе туманы густыя,
Ноч свае чары разліла па зямлі.

Прыпеў:

Толькі клуб за сялом
Ззяе яркім святлом:

Ў клубе танцы у разгары,
Вальс іграюць баяны.

Там, дзе разносіцца спеў салаўіны,
Дзе над ракою ціха дрэмлюць сады,
Хлопец сустрэўся з каханай дзяўчынай,
Ласкава свеціць месяц ім залаты.

Прыпеў:

Ярка зоры гарацць,
Песні ў клубе звіняць,
Плаўна кружаць ў танцы пары,
Вальс іграюць баяны.

Скора іх сонца ізноў прывітае
Ранняй парою на прасторах палёў,
Ніва густая паклонам спаткае,
Песню дзяўчаты запяюць пра любоў.

Прыпеў:

Занялася зара,
Расставацца пара...
І апошні развітальны вальс
Іграюць баяны.
Звонка граюць вальс баяны, } 2 р.
Развітальны вальс.

# ЦІХІ ВЕЧАР

*Словы А. Русака* *Музыка Г. Вагнера*



Ціхі вечар у сузор'і
Над сялом плыве,
Засвяціліся агнямі
Росы на траве.
Не сама к табе прыйшла я —
Сэрца прывяло,
А свайму я сэрцу веру —
Шчасце тут знайшло.

Не пытайся аб каханні,
Бо не адкажу,
Толькі знаю, што адна я
Без цябе тужу.
Толькі знаю, што пазнала
Радасць я з табой,
Толькі знаю, што адзіны
Ты, любімы мой.

Заўтра мы насустрач сонцу
Выйдзем у палі,
Дзе красою веснавою
Нівы расцвілі.
А сягоння ясны месяц
Выплыў за сяло,
Не сама к табе прыйшла я —
Сэрца прывяло.

# ПАД ЦЁМНЫМ ЛЯСКОМ

*Словы П. Глебкі* *Музыка А. Багатырова*




Пад цёмным ляском
Бяроза з лістком
Ўсё лета шумела:
— Ты, мой лісточак,
Ты, мой зялёны,

Ты мяне кідаць будзеш.
Ветры павеюць,
Цябе абвеюць —
Я адна застануся.

— Мая бярозка,
Мая белая,
Я ж цябе не забуду,
Я ж цябе не забуду,
Я ж цябе не забуду,
На вясну к табе буду,
На вясну к табе буду
І шумець з табой буду,
І шумець з табой буду.

А ў цёмным ляску
Дзяўчына дружку
Ў слязах гаварыла:
— Ты, мой малойчык,
Ты, мой саколік,
Ты мяне кідаць будзеш.
Трубы зайграюць,
У бой паклічуць —
Я адна застануся.

— Мая дзяўчынка,
Мая каханка,
Я ж цябе не забуду,
Я ж цябе не забуду,
Па вясне к табе буду,

Па вясне к табе буду
І гуляць з табой буду,
І гуляць з табой буду!
І гуляць з табой буду!

# ЯК У ЛЕСЕ ЗАЦВІТАЛІ

*Словы Я. Купалы* *Музыка Р. Пукста*






Як у лесе зацвіталі
Ліпа ды каліна,
Залатыя сны снавалі
Мы з табой, дзяўчына.

Калыхаліся, шумелі
Вольныя бярозы,
Шапацелі, шалясцелі
Трыснягі ды лозы.

Як у жыце наліліся
Каласкі начынна,
Сустрэліся, абняліся
Мы з табой, дзяўчына.

Мігацелі, зіхацелі
У пракосах косы,
Заміралі кветкі, зелле,
Заміралі росы.

Як даспела, счырванела
Ягада рабіна,
Ўвакол глянулі нясмела
Мы з табой, дзяўчына.

Верасы пад лісцем спалі,
Бор зялёны гнуўся,
Недзе пелі ў цёмнай далі
Журавы ды гусі.

# ПЕСНЯ ПРА ДЗЯЎЧЫНУ МАЛЬВІНУ

*Словы Р. Сабаленкі* *Музыка М. Аладава*






Ой, жыла-была Мальвіна,
Вельмі спрытная дзяўчына,
У калгасе працавала,
Ніякой бяды не знала;
Многа мела працадзён
За кудравы доўгі лён.
Пела песні галасіста
Аб дзявочай долі чыстай,
Ў мацеры адна была
І, як кветачка, цвіла.

Толькі й думку мела маці,
Каго выбраць сабе зяцем:
Ці механіка Антона,
Ці настаўніка Лявона.
Сватаў дзеўчыну Нупрэй,
Уздыхаў па ёй Сяргей.
Ох, і мела ж маці клопат —
Хто між іх найлепшы хлопец?
А ўсе хлопцы хоць куды —
Кожны спрытны, малады.

Ляжа спаць, а ёй не спіцца:
Як бы тут не памыліцца?

6 Зак. 993

Хваляць людзі і Антона,
Паважаюць і Лявона,
Любы ўсім цяпер Нупрэй,
Неблагі жаніх Сяргей...
Пайшла радзіцца старая
Да суседа Мікалая...
А Міколка чырванеў,
Ёй у вочы не глядзеў.

Доўга маці меркавала,
А Мальвіна не чакала:
Як ёй сэрца падказала —
Мікалая пакахала,
Што з ёй разам вырастаў,
Ў адным полі працаваў.
І не думалася маці,
Што Міколка будзе зяцем...
Дык нашто ж было шукаць —
Сам прыйшоў у хату зяць!

# ТЫ МНЕ ВЯСНОЮ ПРЫСНІЛАСЯ

*Словы М. Шушкевіча* *Музыка Ю. Семянякі*






Летняя ночка купальная
Яснай растаяла знічкаю.
Падаюць зоры світальныя
Ў чыстыя воды крынічныя.
Ой, ты, дзяўчыначка мілая,
Як жа ты свет упрыгожыла,
Ластаўка ты легкакрылая,
Светлы мой сон растрывожыла.

Ты мне вясною прыснілася
Неразгаданымі чарамі,
Сэрца парыўна забілася
Вольнымі крыламі-марамі.
Пэўна, цябе, ненаглядная,
Стрэў я часінай удалаю.
Ты мая доля спагадная,
І не шкадую ні мала я.

# ТОЛЬКІ З ТАБОЮ

*Словы А. Русака* *Музыка І. Любана*




Толькі з табою мне хочацца быць,
Толькі з табою,
Радасць, і гора, і шчасце дзяліць
Толькі з табою.

Ранняй часінкай к табе я лячу,
Позняй парою,
Толькі к табе прыхіліцца хачу
Сэрцам, душою.

Выйсці у поле, дзе нівы шумяць,
Там, над ракою,
Першую зорку на небе спаткаць
Толькі з табою.

Гэтак не страшны цяжкія пуці
Будуць з табою,
Гэтак ісці неразлучна ў жыцці
Толькі з табою.

# ЧЫРВОНАЯ ВЯРГІНЕЧКА

*Словы А. Русака* *Музыка Н. Сакалоўскага*




Чырвоная вяргінечка,
Прыгожая дзяўчыначка!
Ой, ё-ёй, ой, ё-ёй,
Што зрабіла ты са мной?

Калі дзень цябе не бачыў,
Нібы цэлы дзень я трачу.
Ой, ё-ёй, ой, ё-ёй,
Што зрабіла ты са мной?

Ані ўдзень, ані ўночы
Не заплюшчваюцца вочы.
Ой, ё-ёй, ой, ё-ёй,
Што зрабіла ты са мной?

А ці любіш, ці не любіш,
Толькі сэрца маё губіш.
Ой, ё-ёй, ой, ё-ёй,
Што зрабіла ты са мной?

# СЛУЦКІЯ ТКАЧЫХІ

*Словы М. Багдановіча* *Музыка М. Мацісона*



Ад родных ніў, ад роднай хаты
У панскі двор дзеля красы
Яны, бяздольныя, узяты
Ткаць залатыя паясы.

І цягам доўгія часіны,
Дзявочыя забыўшы сны,
Свае шырокія тканіны
На лад персідскі ткуць яны.

А за сцяной смяецца поле,
Зіяе неба з-за акна,—
І думкі мкнуцца мімаволі
Туды, дзе расцвіла вясна;

Дзе блішча збожжа ў яснай далі,
Сінеюць міла васількі,
Халодным срэбрам ззяюць хвалі
Між гор ліючайся ракі;

Цямнее край зубчаты бору...
І тчэ, забыўшыся, рука
Заміж персідскага узору
Цвяток радзімы васілька.

# ЯВАР І КАЛІНА

*Словы Я. Купалы* *Музыка Ю. Семянякі*



Песняй вясны лебядзінаю,
Скінуўшы зімнія чары,
Шэпчуцца явар з калінаю
Ў сумнай даліне над ярам.

Лісцікі зеленяй хваляцца
Небу панятлівай мовай,
Росамі мыюцца раніцай,
Песцяцца сонцам паўднёвым.

Чуецца музыка дзіўная
Ў повесцях сонных імшараў.
Цешыцца явар з калінаю,
Скінуўшы зімнія чары.

# ВЯСЕЛЬНАЯ-ЗАСТОЛЬНАЯ

*Словы А. Русака* *Музыка І. Кузняцова*




Ой, не п'ецца гарэлка,
Ой, не п'ецца віно.
Хто ж налье таго мёду,
Каб салодка было.

Паміж нас маладыя
За вясельным сталом,
Павянчалася шчасце
Ды пад шлюбным вянком.

Горка, горка гарэлка
За вясельнай гульбой,
Падсалодзяць нам чаркі
Малады з маладой!

Падсалодзяць тым шчасцем,
Што два сэрцы зліло,
Каб вясёлым, мядовым
Век жыццё іх было!

# ДЗЕ ТЫ, ЗОРКА МАЯ

*Словы А. Русака* *Музыка І. Лучанка*




Дзе ты, зорка мая прамяністая,
За якія ты хмары скацілася?
Дзе ты, радасць мая залацістая,
На якой ты сцяжынцы згубілася?

Я шукаю цябе, углядаюся
У нябесныя далі высокія.
Без цябе мне дарога не ясная,
Што ляжыць у прасторы далёкія.

Дзе ты, зорка мая прамяністая,
За якія ты хмары скацілася?
Дзе ты, радасць мая залацістая,
На якой ты сцяжынцы згубілася?

Дзе ж ты, зорка мая непагасная,
За якімі ты скрыта аблокамі?
Узыдзі, засвяці, зорка ясная,
Шчасцем сэрцу майму адзінокаму.
Дзе ты?

# СВІЦЯЗЯНКА

*Словы І. Скурко* *Музыка К. Цесакова*



Салаўінам майскім ранкам
На семнаццатай вясне,
Сіцязянка, сіцязянка,
Напаткалася ты мне.

Кругам паплыла палянка,
Захістаўся лес стары...
Сіцязянка, сіцязянка,
Воч блакітныя віры.

Праз дажджы і праз маланкі
Я к табе любоў нясу,
Сіцязянка, сіцязянка,
Мая радасць і мой сум.

Сіцязянка, сіцязянка,
Не адна вясна міне,
Ты нязгаснаю заранкай
Вечна будзеш для мяне.

# ПЕСНЯ БАБЫЛЯ

*Словы народныя* *Музыка А. Туранкова*






Сам не знаю, не ведаю,
Што рабіці маю.
Людзі кажуць жаніціся,
А я і не думаю. } 2 р.

Нашто мне жаніціся,
Нашто мне жонка,
Ёсць ў мяне суседачка,
Добра прыяцелька. } 2 р.

Маладзіцы, удавіцы
На мяне маргаюць,
То ў нядзелю, то на свята
Мяне запрашаюць: } 2 р.

— Прыйдзі, прыйдзі, хлопчык
мой, ты
Ка мне на хвіліну,
А я вышлю свайго дзеда
У лес па каліну. } 2 р.

Сам не знаю, не ведаю,
Што рабіці маю.
Людзі кажуць жаніціся,
А я і не думаю. } 2 р.

# ЯБЛОНЬКА

*Слова А. Суркова* — *Музыка Р. Бутвиловского*






Не яблочко румяное
Сожгла зима в саду —
Пришла любовь незваная
На девичью беду.
Пришла любовь незваная,
Как летняя гроза.
Знать, не на радость глянула
Я в синие глаза.

Звезда моя печальная,
Зажгись и помоги
Услышать песню дальнюю,
Знакомые шаги.
Кудрявая сутулится
Березка над рекой,—
Пройди по нашей улице
И сердце успокой.

Не яблочко румяное
Сожгла зима в саду —
Пришла любовь незваная
На девичью беду.
Пришла любовь незваная,
Как летняя гроза.
Знать, не на радость глянула
Я в синие глаза.

# БЫВАЙЦЕ ЗДАРОВЫ!

*Словы А. Русака* *Музыка І. Любана*




Бывайце здаровы,
Жывіце багата,
Ужо ж мы паедзем
Да сваёй хаты.
Мы слаўна гулялі
На вашым вяселлі,

Было ж нам даволі
Ўсяго, што хацелі.

У вашым калгасе
Шырокае поле,
Няхай жа для шчасця
Цвіце ваша доля.
На рэчках на вашых
Муціліся б воды,
Каб плавалі з крыкам
Гусей карагоды.

Каб жыта у полі
Трубою вілося,
А ў хаце каб сала
Кублямі вялося.
Штодзень у капусце
Каб плавала скварка,
А к ёй, калі трэба,
Знайшлася б і чарка.

Каб вам шанцавала
Ды часта на госці,
Ніхто б ды ніколі
Не меў на вас злосці.
Не толькі каб людзі
Ад вашай брыгады —
Каб вашаю працай
Мы ўсе былі рады.

Жадаем яшчэ вам
Прыбытку у хаце,
Ні мала, ні многа —
Штогод па дзіцяці.
Не будзе вам крыўды
Яшчэ і за тое,
Калі пашанцуе
На год і па двое.

Дарогі ж мы знаем
Да вас, ягамосці,
І ездзіць мы будзем
Да вас часта ў госці.
Эх, то на адведы,
Эх, то на радзіны,
Вазіць караваі
Па дзве паўасміны.

Бывайце здаровы,
Жывіце багата,
Ужо ж мы паедзем
Да сваёй хаты.

## II

# МОЙ КРАЙ

*Словы А. Русака* *Музыка Я. Ціхановіча*




Куды ні йду — лясы шумяць,
Цвіце за полем гай.
А поле вокам не абняць —
І гэта ўсё мой край.

Жыве, працуе мой народ
Ці ў снежань, ці у май.
І багацее з году ў год
Мой родны вольны край.

Куды ні йду — лясы шумяць,
За полем рэчка, гай.
А ў сэрцы песень не стрымаць
Пра мой любімы край.

## ПРЫВІТАЛЬНАЯ МАСКВЕ

*Словы і музыка П. Шыдлоўскага*



Калоссямі нівы шумяць залатыя,
І рэкі гамоняць між лоз.
Прымі прывітанне, Масква дарагая,
Што я з Беларусі прынёс. } 2 р.

Як вецер вясёлы гамоніць над гаем,
Так золак праменні кладзе.
Мы нашую мудрую партыю славім,
Што нас к камунізму вядзе. } 2 р.

Вядзі ж нас наперад у светлыя далі,
Хай песнямі поўніцца шыр.
З табою, Масква, мы навекі з'яднаны
Ў змаганні за шчасце, за мір. } 2 р.

## ДУМА О ЛЕНИНЕ

*Слова Г. Регистана* *Музыка В. Горбатовского*




Цветет страна — Советская страна,
Она цветет, как сад весенний.
К нам всенародная весна труда
С тобой пришла, любимый,
мудрый Ленин!

Ты для народа Партию создал.
За ней шли в битвы поколенья.
Ты навсегда пути нам указал,

Дорогу к счастью, к свету,
мудрый Ленин!

За славный путь, что мы с тобой прошли,
За путь невиданных свершений
Простые люди мира, всей земли
Тебе поют свой гимн,
бессмертный Ленин!

## НАШ НЁМАН

*Словы Г. Цітовіча* *Музыка П. Шэйко*




Коціць удаль Нёман чыстыя воды,
Лентай блакітнаю здобіць наш край,
Травы шаўковыя берагам сцелюцца,
Ў люстра ракі прыглядаецца гай. } 2 р.

8 Зак. 998

Ведае Нёман наш гора былое,
Слёзы людскія, праклён рыбака.
Песні гаротныя, скаргі народныя,
Панскі прыгнёт помніць Нёман-рака. } 2 р.

Змоўкла над Нёманам песня пакуты:
Сёння аб шчасці пяе тут народ!
Песні вясёлыя, песні бадзёрыя
Льюцца свабодна над хвалямі вод. } 2 р.

Коціць удаль Нёман чыстыя воды,
Шляхам адвечным кіруе плыты,
Травы шаўковыя берагам сцелюцца,
Дно пакрывае пясок залаты. } 2 р.

# РОДИНА

*Слова А. Прокофьева* *Музыка Ю. Талесника*



За Онегой суровой, за Кемью
Выхожу на простор и пою.
Я люблю эту землю,
Я люблю эту землю — } 2 р.
Дорогую Отчизну мою.

Сколько прожито с ней, сколько спето,
Сколько пройдено, сколько дано.
Без нее, как без света,
Без нее, как без света, } 2 р.
Без нее, как без солнца, темно.

Где бы люди меня не спросили,
Я отвечу им так, не солгу:
Мне не жить без России,
Мне не жить без России, } 2 р.
Я дышать без нее не могу.

# ПАЛЕСКІЯ ПРАСТОРЫ

*Словы А. Дзержынскага* *Музыка А. Граса*






Палескія родныя нашы прасторы,
Як глянеш — ім краю нідзе не відаць.
Лясы, пералескі, з блакіту азёры,
Над Прыпяццю вольнай дубровы шумяць. } 2 р.

І там, дзе ляжалі калісьці балоты,
Сады зеленеюць, палі і лугі,
І жыта буйное стаіць, як чароты,
Квітнее цудоўны наш край дарагі. } 2 р.

І ведаюць хвалі Балтыйскага мора,
Што з Прыпяці прыйдуць сюды караблі.
Квітнейце, палескія нашы прасторы,
Любімы куток беларускай зямлі! } 2 р.

# МАРШ КАМУНІСТЫЧНЫХ БРЫГАД

*Словы Ю. Доктарава* *Музыка В. Смірнова*






Вялікі план сямігадовы
Мы к сэрцу шчыра прынялі,
На подзвіг працы мы гатовы
За шчасце наша на зямлі.

Прыпеў:

Ідуць, ідуць ударнікі
Камуністычных брыгад,
Прад імі адкрываецца
Шырокі далягляд.
У працы быць выдатнымі —
Такі ўжо іх звычай,
І ганарыцца знатнымі
Ударнікамі край.

Мы варым сталь ў агні мартэна
Для карпусоў і для машын,

І рапартуе змена змене
Пра кожны слаўны свой пачын.

Прыпеў.

Прыносіць радасць дзень нам новы,
І слова партыі дадзім,
Што сямігодкі пабудовы
Датэрмінова ў строй здадзім.

Прыпеў.

# ДУБОК

*Словы М. Пянкрата* *Музыка П. Ахраменкі*



Кінеш вокам — шырыня такая!
У блакіце птушак галасы.
Бачу: хтосьці, хтосьці мне здалёк ківае
Ад лясной, лясной ахоўнай паласы.

То ж дубок мяне пазнаў зялёны,—
Столькі ў ім бадзёрай пекнаты!
На мае, мае гарачыя далоні
Палажыў, лажыў шырокія лісты.

Да дубка зялёнага хілюся,
Як жа ён так хутка тут акрэп?
Жолудам даспелым, спелым з Беларусі
Ён прыехаў, ехаў у шырокі стэп.

І цяпер у стэпавым разгоне,
Дзе ляглі пакорліва пяскі,
Мы стаім, стаім, абняўшыся, гамонім —
Лепшыя на свеце, свеце землякі.

Адчуваю: пад рукамі б'ецца
У галінках дужы цёплы сок.
Ганаруся, што пад ветрам, ветрам гнецца,
Гнецца, гнецца, ды не зломіцца дубок.

## УРАДЖАЙНАЯ СВЯТОЧНАЯ

*Словы і музыка Р. Галавасцікава*



Мы калгаснаю сям'ёй
Песню запяваем,
Славім свята мы сваё —
Свята ураджаю.

Прыпеў:

Эх, ляці ты, песня, з краю ў край, (ды)
Праслаўляй калгасны ураджай!

Ад прыроды мы спагад
Дома не чакаем,
Ураджай вялікі наш
Самі здабываем.

Прыпеў.

Мы дзяржаве аддалі
Збожжа, колькі трэба,
І насыпалі сабе
У засекі хлеба.

Прыпеў.

Весяліцца наш калгас
Кожнае нядзелі —
Песні звонкія у нас,
Госці ды вяселлі.

Прыпеў.

# ПЕСНЯ АБ НАРАЧЫ

*Словы М. Танка* *Музыка М. Наско*

Andante cantabile



Гарыць агонь. Спакойна дрэмле Нарач,
І ноч, як песня ціхая, без слоў,
На сонны бераг навявае чары,
Калыша хмары-думы рыбакоў.

Прыпеў:

Нарач — наша старана,
Ты — рыбацкая зямля,
Майму сэрцу ты міла.

Часамі хваля падпаўзе пужліва,
Як бы пра нешта хоча запытаць,
Ці можа казку задрамаўшым нівам,
Арцелям сонным хоча расказаць.

Прыпеў.

Спакойна дрэмле Нарач на прыволлі,
І колькі зор у возеры гарыць!
Іх не злічыць, не вылавіць ніколі,
Нат залацістым невадам зары.

# РЕЧИЦКАЯ ЛИРИЧЕСКАЯ

*Слова М. Вишняка* *Музыка Н. Коньшина*






Небо потемневшее вышитым ковром
Широко раскинулось над родным Днепром.
Звезды воду чистую не напьются-пьют,
В лодке парень с девушкой по реке плывут.

Припев:

Ой, не под рябиною
Летним вечерком,
Хорошо с любимою
На реке вдвоем.

Их несет течением быстрая река,
Прокатиться просится месяц с высока.
А с лугов прохладою веет ветерок,
И огнями светится тихий городок.

Припев.

9 Зак. 998

Песня задушевная спорит с соловьем,
И поет в ней девушка что-то о своем,
Как на танцах встретились в парке над
Днепром,
Как сердечко девичье светит огоньком...

Припев.

Сколько встреч задумчивых будет впереди,
А прекрасней Речицы места не найти.
Днепр волной игривою моет берега,
Здесь любовь рождается, крепко — навсегда.

Припев.

# ХОРОШО ВЕСНОЮ БРОДИТСЯ

*Слова М. Исаковского* *Музыка П. Косача*




Хорошо весною бродится
По сторонке по родной,
Где заря с зарею сходится
Над полями в час ночной.

Где такое небо чистое,
Где ночами с давних пор

С молодыми гармонистами
Соловьи заводят спор.

Поглядишь — глазам не верится:
Вдаль на целую версту
То ли белая метелица,
То ль сады стоят в цвету.

Ветка к ветке наклоняется,
И шумит, и не шумит,
Сердце к сердцу порывается,
Песня с песней говорит.

И легко, свободно дышится,
И тебя к себе зовет
Все, что видится и слышится,
Что живет и что поет.

# КУПАЛЬСКАЯ

*Словы В. Лукшы* *Музыка У. Журовіча*



Салаўінай парой
Я сустрэўся з табой
Над ракою купальнаю ночкай.
Поўня тоне ў віры,
І да самай зары
Я ў твае углядаюся вочы.

Каласоў перазвон,
Чуйных ліп парасон,
Ў паднябессі дзянніца
палае.
Далягляд заалеў,
Ды не хочацца мне
Расставацца з табой, дарагая.

Зацвітаюць ільны,
Быццам вочы вясны,
Чмель шчырүе над сінім
званочкам.
Салаўінай парой
Я чакаю з табой
Цёплай стрэчы купальнаю
ночкай.

# ШТО Ж ТЫ МНЕ СЭРЦА ПАРАНІЎ

*Словы Н. Тарас* *Музыка І. Сушко*

Andante cantabile



Ніна Тарас

Сонца за хмаркамі ўранні
Скрылася — болей не свеціць.
Што ж ты мне сэрца параніў,
Мой найдарожшы на свеце.

Як жа мне, як жа развеяць
Хмарачак тых караваны?
Дзе ж мне нарваць таго зелля,
Каб загаілася рана?

Хмаркі развеюцца самі —
Ёсць вецярочак на тое.
Раны не сцішыш слязамі —
Ласка твая іх загоіць.

Сонца за хмаркамі ўранні
Скрылася — болей не свеціць.
Што ж ты мне сэрца параніў,
Мой найдарожшы на свеце.

# БЕЛЫ СНЕГ

*Словы Л. Паўлені* *Музыка Я. Петрашэвіча*






Ой, не мяці, мяцеліца,
Свой белы снег.
Міленькі едзе аселіцай,—
Хай не губляе след.

Прыпеў:

Белы снег, белы снег
Сыплецца.
Белы снег, белы снег
Сцелецца.
Ой, не мяці, мяцеліца,
Белы карагод.

Холадна вельмі ў ножанькі,
Стаю адна.
Снег размяту на дарожаньках,
Стрэну міленькага.

Прыпеў.

Гляну у вочы шчырыя,
Мой чарадзей.
Ой, мары, сны, сны дзявочыя,
Колькі у вас надзей!

Прыпеў.

# РУЧНІКІ

*Словы В. Вярбы* *Музыка М. Пятрэнкі*



У суботу Янка ехаў ля ракі,
Пад вярбой Алёна мыла ручнікі.
— Пакажы, Алёна, броды земляку,
Дзе тут пераехаць на кані раку.

— Адчапіся, хлопец, едзь абы-куды,
Не муці мне толькі чыстае вады,—
У маркоце Янка галавой панік,
Упусціла дзеўка беленькі ручнік.

— Янка, мой саколік, памажы хутчэй,
Ой, плыве, знікае ручнічок з вачэй.
— Любая Алёна, я вады баюсь,
Пацалуй спачатку, бо я утаплюсь.

Супыніўся гнеды пад вярбой густой,
Цалавала Янку Лена над вадой.
Стала ціха, ціха на усёй зямлі,
Па рацэ далёка ручнікі плылі...

# КОЛЬКІ Ў НЕБЕ ЗОР!

*Словы і музыка А. Шыдлоўскага*



Колькі ў небе зор — цяжка палічыць,
Толькі з іх адна найярчэй гарыць.
Гэта ты, мая зорка ясная,
Ты, любоў мая непагасная. } 2 р.

У працы і ў жыцці добра нам з табой
Марыць і любіць з песняй маладой.
Дзе так добра жыць, дзе такі прастор,
Шчасця больш у нас, як на небе зор. } 2 р.

Край шырокі наш, мірны, дарагі,
І бягуць удаль светлыя шляхі.
Мне з табой па іх хочацца ісці
І дзяліць усё разам у жыцці. } 2 р.

# ВЯСЕЛЬНАЯ

*Словы М. Танка,* *Музыка І. Маціна*




Піце гарэліцу, госцейкі, піце,
Слаўную Ганначку нашу любіце.
Першай з брыгадай яна уставала,
Першай на поле ішла працавала.

Весела, госцейкі, песню спявайце,
Песняю Ганначку нашу ўслаўляйце.
Зорка, што свеціць ў яе, залатая
Хай ёй дарогу ў жыццё азарае.

Звонка, музыкі, ў цымбалы звініце,
Коней вясельных ускач не ганіце,
Каб развітацца магла яна з намі,
З полем, знаёмымі ёй каласамі.

Весела, госцейкі, песню спявайце,
Часта ў адведзіны вы прыязджайце,
Будзем і мы, парадніўшыся з вамі,
Частымі ў вашым калгасе гасцямі.

Танец хай стужкі вясёлкамі кружыць,
Шчасце хай з нашаю Ганначкай дружыць.
За маладых уздымаем мы чаркі,
Ярка свяці, наша сонейка, ярка!

# МЯЦЕЛІЦА

*Словы А. Дзеружынскага* *Музыка М. Шуміліна*




10 Зак. 998

Ой, мяцеліца,
Ой, мяцеліца
Ўсе дарожкі замяла.
Як мне, дзеўчыне,
Як мне, дзеўчыне,
Ехаць з любым да сяла? } 2 р.

Я сняжыначкі,
Я сняжыначкі
Сваім сэрцам растаплю.
Ведай, міленькі,
Ведай, міленькі,
Цябе моцна я люблю. } 2 р.

Ой, мяцеліца,
Ой, мяцеліца
Пагуляла і пайшла...
А вяселейка,
А вяселейка
Едзе з песняй да сяла. } 2 р.

## III

# ЛЮБЛЮ НАШ КРАЙ

*Словы К. Буйло*




Люблю наш край — старонку гэту,
Дзе я радзілася, расла,
Дзе першы раз пазнала шчасце, } 2 р.
Слязу нядолі праліла.

Люблю народ наш беларускі
І хаты ў зелені садоў,

Залочаныя збожжам нівы,
Шум нашых гаяў і лясоў. } 2 р.

І жніва час душой люблю я,
І першы звон сярпоў і кос,
Калі на поле выйдуць жнеі,
А касары на сенакос. } 2 р.

І песню родную люблю я,
Што ў полі жнеі запяюць,
Як гукі звонкія над нівай
Пераліваюцца, плывуць. } 2 р.

Люблю ў пагодную я ночку
Да позна ў садзіку сядзець,
Сачыць за ясных зор мігценнем,
На месяц залаты глядзець. } 2 р.

Мне тут усё для сэрца міла,
Бо я люблю край родны свой,
Дзе з першым шчасцем я спазналась
І з першай горкаю слязой. } 2 р.

## ЖАВАРОНАЧКІ, ПРЫЛЯЦІЦЕ!




Жаваронaчкі, прыляціце,
Цёпла лецейка прынясіце,
А зімачку прыбярыце,
Бо зімачка надаела —
Нам хлебушкі пераела.

Жаваронaчкі, прыляціце,
Землю-матухну абудзіце.
І дожджыкам напаіце,

Каб травачкі нарасціла,
Каб волікаў накарміла.

Жавароначкі, прыляціце,
Цёпла лецейка прынясіце,
А зімачку прыбярыце,
Бо зімачка надаела —
Нам хлебушкі пераела.

## СПІ, СЫНОЧАК МІЛЕНЬКІ




Спі, сыночак міленькі,
Галубочак сізенькі.
Мой сыночак будзе спаць,
А я буду калыхаць.

Нашто, вецер, ты гудзеш,
Спаць Міхаську не даеш?
Спі, сыночак міленькі,
Ой, да люлі, люленькі...

Ўспомніш матку ты сваю,
Як цябе люляла,
Як табе уноч не раз
Песеньку спявала.

ДЛЯ ДАЧКІ:

Спі, дачушка мілая,
Галубачка сізая.
Мая дочка будзе спаць,
А я буду калыхаць.

Нашто, вецер, ты гудзеш,
Спаць Марысі не даеш?
Спі, дачушка мілая,
Я цябе палюляю.

# КУПАЛІНКА




Купалінка, купалінка,
Цёмная ночка,
Цёмная ночка,
Дзе ж твая дочка?

Мая дочка у садочку
Ружу, ружу поліць,
Ружу, ружу поліць,
Белы ручкі коліць.

Кветачкі рвець, кветачкі рвець,
Вяночкі звівае,
Вяночкі звівае,
Слёзкі праліваае.

## ПЕРАПЁЛКА




Перапёлка,
Трысцяно гняздзечка,
Залато яечка,
Перапёлка.

Перапёлка,
Не вій ты гняздзечка
Блізка пры дарожцы,
Перапёлка.

Перапёлка,
Пастушкі пагоняць,
Яечкі заберуць,
Перапёлка.

Перапёлка,
А звій ты гняздзечка
На зялёным дубе,
Перапёлка.

Перапёлка,
Вецярок павеіць,
Дзетак пакалышыць,
Перапёлка.

Ой, дзеванька!
Не вій ты вяночка —
Восень недалёчка,
Ой, дзеванька.

Ой, дзеванька!
Сваточкі прыедуць,
Цябе з сабой возьмуць,
Ой, дзеванька.

# САЛАВЕЙКА, ПТАШАЧКА МАЛЕНЬКА




Салавейка, пташачка маленька,
Дзе ж ты будзеш зімку зімаваці?

Дзе ж ты будзеш зімку зімаваці,
Дзе ж ты будзеш гняздзечка звіваці?

Не ляці ты за сіняе мора,—
Звій гняздзечка у маёй каморы.

Ты нас будзеш песняй весяліці,
А мы будзем хлебушкам карміці.

Ты нам будзеш песенькі спяваці,—
Стане ўзімку лецейка у хаце.

## ОЙ, СКАРЭЙ БЫ ВЯЧОРА ДАЖДАЦІ




Ой, скарэй бы вячора даждаці:
Пойдуць людзі дзяўчыну сватаці.

Пойдуць людзі дзяўчыну сватаці,
А мы пойдзем пад акно слухаці.

А мы пойдзем пад акно слухаці,
Ды што будзе дзяўчына казаці.

Дзеўка ходзіць ды ўсё пахаджае,
Белы ручкі на сэрцы складае.

— Маці, маці, параднiца ў хаці,
Парадзь, маці, што свату казаці?

Парадзь, маці, што свату казаці:
Ці йсці замуж? Ці з год пагуляці?

# ПРЫЙШОЎ НА ВЯСЕЛЛЕ НАШ СВАТОК




Прыйшоў на вяселле наш сваток,
Павязаўшы крыжам ручнічок.

А казалі, сват наш вельмі харош,
Аж у свата доўгі буслаў нос.

А у свата лыса галава
Ды казліна рыжа барада.

Плавае па хаце, як таран,
Лыпае вачыма, як баран.

Калі, сват, гарэлкі не дасі,
Караваю трасцу ты з'ясі.

# КУМА МАЯ, КУМАЧКА




Кума мая, кумачка,
Дзе жывеш? } 2 р.
Чаму мяне ў госцейкі
Не завеш? } 2 р.

Ці ты, куме, розуму
Пытаеш? } 2 р.
Ці ты маёй хатачкі
Не знаеш? } 2 р.

А вунь мая хатачка
Ля вады, } 2 р.

З высокага дзераўца, } 2 р.
З лебяды.

Яшчэ к таму сенечкі } 2 р.
Прыпляту,
З харошага дзераўца, } 2 р.
З асату.

Тады цябе ў госцейкі } 2 р.
Пазаву,
Як свежае рыбачкі } 2 р.
Навару.

А свежая рыбачка — } 2 р.
Акунёк,
А любенькі госцічак — } 2 р.
Мой кумок!

11 Зак. 998

## ЧАЧОТАЧКА

Allegro




Спарадзіла чачотачка семера дачок,
Спарадзіла невялічка семера малых:
І Аўгінню, і Аксінню,
І Тацюху, і Насцюху,
І Марыну, і Грыпіну,
Сёмую — Хімку. (2 р.)

Спарадзіўшы і ўзрасціўшы, замуж
аддала.—
Бадай тая чачотачка здарова была!
А Аўгінню за Мірона,
А Аксінню за Сапрона,
А Тацюху за Дзяміда,

А Насцюху за Спірыда,
Радзівону — Марыну,
Харытону — Грыпіну,
Хімку за Кузьму. (2 р.)

Як пачала чачотачка пасагі даваць,
Як пачала невялічка ды ўсіх абдараць:
А Аўгінні — паясок,
А Аксінні — кажушок,
А Тацюсе — пялёначкі,
А Насцюсе — суконачкі,
А Марыне — чаравічкі,
А Грыпіне — рукавічкі,
Хімцы — істужкі. (2 р.)

Былі дзеўкі на вяселлі і малодзіцы,
Былі старэнькія бабкі і удовіцы:
Маня, Таня і Гануся,
І Хадора, і Барбуся,
І суседкі ўсе. (2 р.)

Нанімала чачотачка скочну музыку,
Нанімала невялічка капэлю усю:
Верабейка — на скрыпіцы,
Салавейка — на прытыцы,
А сарокі — у прыскокі,
А вароны — у далоні,
Чорны галкі — у цымбалкі,
Дробны птушкі — у свісталкі,
Люба слухаць, як зайгралі
Музыку сваю. (2 р.)

А чачотка не гуляла — варыла асу,
Доўга госці асу елі, пакуль з'елі ўсю.
  Аж на трэцюю нядзелю
  Госці дамоў захацелі,
  Дзякавалі за веселле,
  Ехалі дамоў,
  Ехалі дамоў.

## ДА Ў ЗЯЛЁНАЙ ДУБРОВЕ




Да ў зялёнай дуброве,
Эх, там Дуня волы пасла.
Напасціўшы волы,
Пайшла ў сад гуляці.

Пакуль Дуня гуляла,
Эх, свае волы пагубляла.
Што Дуні рабіці? —
Будзе маці біці.

Будзе маці Дуню біць,
Эх, стануць бабы гаварыць:
— Няўдала дзяўчына,
Не вазьму за сына.

Да ў зялёнай дуброве,
Эх, там Дуня волы пасла,
Напасціўшы волы,
Пайшла ў сад гуляці.

## ВЯНЕ РУТА




Вяне рута ля прысадаў:
Чарнявая дзяўчыненька —
Мне дасада! } 2 р.

І не піў бы, і не еў бы,—
Да чарнявае дзяўчыны
Паляцеў бы! } 2 р.

Паляцеў бы, ды не мушу:
Распаліла чарнявая
Сэрца, душу. } 2 р.

— Ці ты п'ян быў, ці змыліўся,
Што ў такую некрасівую
Улюбіўся? } 2 р.

— Я не п'ян быў, не змыліўся:
У дзявочы ясны вочы
Улюбіўся! } 2 р.

## ШТО ЗА МЕСЯЦ, ШТО ЗА ЯСНЫ?




Што за месяц, што за ясны,—
Ўночы свеціць, а ўдзень не.
Што за міленькі дружочак,—
Калі прыйдзе, калі не.

Усе людзі, людзі кажуць,
Усе людзі гавараць:
— Сорам, дзеўка, сорам, красна,
Позна звечара гуляць.

Дзяўчыначцы кепска стала,
Стала плакаць ды ўздыхаць,

Хлапчыноньку шкода стала,
Стаў дзяўчынку суцяшаць.

— Не плач, дзеўка, не плач, красна,
Прыйду ў госці да цябе,
Разгарыцца кроў гарача —
Вазьму замуж за сябе.

## ТАМ КАЛЯ МЛЫНА




Там каля млына  
Цвіла каліна.  
Дзе ж тая дзяўчына,  
Што мяне любіла? } 2 р.

Не так любіла,  
Як шанавала,  
Купіла коніка,  
Падаравала. } 2 р.

А той конічак,  
Быстрыя ногі,  
Вёз мяне да мілай  
Зблудзіў з дарогі. } 2 р.

Ані сцяжынкі,
Ані дарогі.
У хлопца сэрданька
Млее з трывогі. } 2 р.

— З кім мая міла
Ручанькі звяжа,
З кім мая міла
Спатанькі ляжа? } 2 р.

— Ой, ляжа, ляжа
Сама з сабою,
Белыя ручанькі
Пад галавою. } 2 р.

## ЗЯЛЁНЫ ДУБОЧАК




Зялёны дубочак,
Шырокі лісточак.
Куды вецер вее, }
Туды голлі гнуцца. } 2 р.

Куды вецер вее,
Туды голлі гнуцца.
Па ветру да мілай }
Ўсе весці нясуцца. } 2 р

Сягоння субота,
А заўтра нядзеля.
— Чаму ў цябе, хлопча, } 2 р.
Кашуля не бела?

— Як жа будзе бела,
Хоць заўтра нядзеля:
Мамка ў мяне стара, } 2 р.
Сястра ў мяне мала.

Мамка ў мяне стара,
Сястра ў мяне мала,
Дзяўчына кахана } 2 р.
Любіць перастала.

Пераплыву рэчку,
Сяду на брусочку,
Ці не прыйдзе міла } 2 р.
Памыць мне сарочку?

## ЗАБАЛЕЛА ДЫ МАЯ ГАЛОВАНЬКА




Забалела ды мая галованька,
Забалела галава.
Гэй! Гэй! Гэй! Забалела галава.

А што ж будзе, калі з той галованькі,
Можа я памру, памру?
Гэй! Гэй! Гэй! Можа я памру, памру?

Ой, пайдзіце, ка мне прывядзіце
Ды каго жа я люблю.
Гэй! Гэй! Гэй! Ды каго жа я люблю.

Прывядзіце ка мне Кацярыначку,
Ці не жыў жа буду я?
Гэй! Гэй! Гэй! Ці не жыў жа буду я?

# У ПОЛІ БЯРОЗА




У полі бяроза
Кудрава стаяла.
Хто йдзе — не мінае,
Бярозу ламае.
Гора таму жыці,
Хто пары не мае.

Гора таму жыці,
Хто пары не мае:
Дадому прыходзіць —
Адзін спаць лягае.
Да сцяны вачыма,
Да хаты плячыма.

12 Зак. 998

Да сцяны гаворыць,
А яна не чуе:
— Хто ж мяне прытуліць,
Вячэру згатуе,
Румяныя губкі
Хоць раз пацалуе?

Адазвалась Галя
Ў сенях за дзвярыма:
— Цябе прытулю я,
Вячэру згатую,
Румяныя губкі
Сто раз пацалую!

## РЭЧАНЬКА




Ой, рэчанька, рэчанька,
Чаму ж ты не поўная?
Люлі, люлі, люлі,
Чаму ж ты не поўная?

Чаму ж ты не поўная,
З беражком не роўная?
Люлі, люлі, люлі,
З беражком не роўная?

А як жа мне поўнай быць,
З беражкамі роўнай плыць?
Люлі, люлі, люлі,
З беражкамі роўнай плыць?

Янка коніка паіў,
Маня воду чэрпала.
Люлі, люлі, люлі,
Маня воду чэрпала.

# А НА ДВАРЭ ДЗЕНЬ БЯЛЕНЬКІ




— А на дварэ дзень бяленькі, (2 р.)
Ці не прыйдзе мой міленькі?

Ой, на дварэ дзень світае, (2 р.)
А ў мілога міла пытае:

— Дзе ж ты, мілы, валачыўся, (2 р.)
Што па пояс замачыўся?

— Я ішоў к табе расою, (2 р.)
Па пожаньцы над ракою.

# ЗОРКА ВЕНЕРА

*Словы М. Багдановіча*




Зорка Венера ўзышла над зямлёю,
Светлыя згадкі з сабой прынясла.
Помніш, калі я спаткаўся з табою,
Зорка Венера ўзышла.

З гэтай пары я пачаў углядацца
Ў неба начное і зорку шукаў.

Ціхім каханнем к табе разгарацца
З гэтай пары я пачаў.

Але расстацца нам час наступае;
Пэўна, ўжо доля такая у нас...
Моцна кахаў я цябе, дарагая,
Але расстацца нам час.

Буду ў далёкім краю я нудзіцца,
Ў сэрцы любоў затаіўшы сваю;
Кожную ночку на зорку дзівіцца
Буду ў далёкім краю.

Глянь іншы раз на яе,— у расстанні
З ёю зліем мы пагляды свае...
Каб хоць на міг уваскрэсла каханне,
Глянь іншы раз на яе...

# ЗАКАЦІСЬ, ЯСНАЕ СОНЕЙКА




Закацісь, закацісь
Ты, яснае сонейка,
Хоць за лес, за лясок.
Ты прыйдзі ка мне,
Мой мілы дружочак,
Хоць на час, на часок.

Хоць на час, на часок,
На мінутачку,
На цябе пагляджу.
Свае думачкі

Невясёленькія
Я табе раскажу.

А хацела ж мяне
Мая мамачка
За нялюбага аддаць,
А хацелася ж мне,
Мой мілы дружочак,
Ды цябе пачакаць.

## ПРЫЛЯЦЕЛІ ГУСІ




Прыляцелі гусі
З далёкага краю,
Замуцілі воду
На ціхім Дунаю.

— Пачакайце, гусі,
Я ў вас запытаю:
Ці не з таго краю,
Адкуль мужа маю?

Ці ён там запіўся,
Ці ён загуляўся,
Ці з гора-печалі
Ў чужы край падаўся?

— Ён жа не запіўся,
Ён не загуляўся,
З гора ды печалі
Ў чужы край падаўся...

Ой, у полі жыта
Золатам абліта,
Пад белай бярозай
Ляжыць казак ўбіты.

Ой, ён жа убіты
Ды ляжыць накрыты:
Вочкі — кітайкою,
Ножкі — асакою.

Ды прыйшла дзяўчына,
Кітайку падняла,
Пазнала мілога —
Горка зарыдала.

## ЦІ СВЕТ, ЦІ СВІТАЕ




Ці свет, ці світае,
Ці на зоры займае?
А мой міленькі,
Голуб сівенькі, } 2 р.
Коніка сядлае.

Сядлай, мілы, каня,
Каня вараненькага,
Прыязджай, мілы,
Не кідай, мілы, } 2 р.
Мяне маладзеньку.

Ці ж я не такая,
Як і тая, другая,—
Я харошая,
Я прыгожая,
Толькі доля ліхая. } 2 р.

У полі асінку
Вецярок калыхае,
А мой міленькі,
Чорнабрывенькі,
Ад мяне уцякае. } 2 р.

## ОЙ, РАЗВІЛАСЯ ЗЯЛЁНА ДУБРАВА




Ой, развілася зялёна дубрава
На той круценькай гарэ,
Ой, разышлася варожа забава
Аб маёй дзявочай красе.

Вецер павее, сонейка прыгрэе,
Ранняя раса ападзе,

Так мая доля, краса маладая,
На век вечны прападзе.

А у дубраве пташачка спявае,
Тонкі голас падае,—
Дзеўка гукае, долю выклікае,
Толькі доля к ёй не ідзе.

# КАЦІЛАСЯ ЧОРНА ГАЛКА




Кацілася чорна галка
Па бару, па бару,
А за ёю ясны сокал
Паблізу, паблізу!

Прыпеў:

— Пастой, чорна галка,
Ты мая, ты мая!

Яна яму шчабятала:
— Не твая, не твая!

Я убога сіратцінка,
А ты пан, а ты пан;
Пашукай сабе дзяўчынку,
Як ты сам, як ты сам!

**Прыпеў.**

Праляцеў я ўсе апушкі
І лясоў і бароў
І нідзе такое птушкі
Не знайшоў, не знайшоў.

**Прыпеў.**

13 Зак. 998

## ЦІ ЎСЕ ЛУГІ ПАКОШАНЫ?




Ці ўсе лугі пакошаны,
Ці ўсе сенажаці?
Пытаецца сын у мацеры, } 2 р.
Ды каторую ўзяці?

А ці тую багатую,
Што хораша ходзіць?
А ці тую сіраціначку, } 2 р.
Што ўсё добра робіць?

А ці тую багатую,
Што валы, каровы,
А ці тую сіраціначку, } 2 р.
Што чорненькія бровы?

У багатай, нехарошай
Валы паздыхаюць,
А у беднай сіраціначчкі
Броўкі не зліняюць. } 2 р.

## А Ў ПОЛІ ВЯРБА




А ў полі вярба,
Пад вярбой вада,
Там хадзіла, там гуляла
Дзеўка малада. } 2 р.

Дзеўка ад вады,
Хлопец (казак) да вады:
— Пастой, пастой, дзяўчыначка,
Дай каню вады. } 2 р.

— Рада б пастаяць,
Каню вады даць,

Мае босенькія ножкі,— } 2 р.
Сцюдзёна стаяць.

— Я зніму парчу,
Ножкі увярчу,
А назад як я вярнуся, } 2 р.
Боцікі куплю.

— Не купляй ты мне,
А купі сабе:
Ёсць у мяне татка, мамка, } 2 р.
Яны купяць мне.

## АЙ, ЗЕЛЕНА, ЗЕЛЕНА




Ай, зелена, зелена траўка на мяжы.
Таму ж яна зелена, бо ідуць дажджы.

Ой, молада, молада у мужа жана,
Таму ж яна молада, што доля міла.

Ой, спіць у пярыначках да белага дня,
Пакуль збудзіць міленькі, як мала дзіця.

— Ўставай, ўставай, мілая, досыць табе спаць,
Вараныя конікі ўпрэжаны стаяць.

Садзіся, міленькая, к мамцы павязу,
Ўсю тваю радзімачку табе пакажу.

# ЯК САРВУ Я РУЖЫ КВЕТКУ




Як сарву я ружы кветку
Ды пушчу на воду:
— Плывi, плывi, ружы кветка,
Да самага броду.

Плыла, плыла ружа-кветка
Ды стала круцiцца,
Выйшла мацi воду брацi
Ды стала дзiвiцца.

— Што ж ты, мая ружа-кветка,
На вадзе завяла?
Вiдаць, доўга ты, дзiцятка,
На вадзе ляжала?

— Ой, пі, маці, ту вадзіцу,
Што я нанасіла,
Любі, маці, таго зяця,
Што я палюбіла.

— Ой, не буду вады піці,
Буду разліваці,
Не буду зяця любіці,
Буду забываці.

# О, НЕ КУКУЙ, ЗЯЗЮЛЕНЬКА, РАНА




О, не кукуй, зязюленька, рана,
Гэй, гэй, зязюленька, рана.

Ды не кажы, што ночанька мала.
Гэй, гэй, што ночанька мала.

Я, молада, ўсю ночаньку не спала.
Гэй, гэй, ўсю ночаньку не спала.

Міленькага з дарожанькі чакала.
Гэй, гэй, з дарожанькі чакала.

Мой міленькі прыехаў так позна.
Гэй, гэй, прыехаў так позна.

Параскідаў падушачкі розна.
  Гэй, гэй, падушачкі розна.

А на каго ж, мой міленькі, злуеш?
  Гэй, гэй, мой міленькі, злуеш?

Што мае падушачкі псуеш?
  Гэй, гэй, падушачкі псуеш.

Злую на тваю мамку старую.
  Гэй, гэй, на мамку старую.

Што аддала цябе маладую.
  Гэй, гэй, цябе маладую.

Было не сеч зялёнага дуба.
  Гэй, гэй, зялёнага дуба.

Было не браць, калі я не люба.
  Гэй, гэй, калі я не люба.

О, не кукуй, зязюленька, рана.
  Гэй, гэй, зязюленька, рана.

# ЧАМУ Ж МНЕ НЕ ПЕЦЬ?




Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець,
Калі ў маёй хатаньцы
Парадак ідзець? } 2 р.

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець,
Мушка на вакенцы
У цымбалкі б’ець. } 2 р.

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець,
Павучок на сценцы
Кросенцы снуець. } 2 р.

Чаму ж мне не пецьь,
Чаму ж не гудзецьь,
Мой сынок ў калысцы, } 2 р.
Як бычок равецьь.

Чаму ж мне не пецьь,
Чаму ж не гудзецьь,
Парсючок пад лаўкаю } 2 р.
Бульбачку грызецьь.

Чаму ж мне не пецьь,
Чаму ж не гудзецьь,
Петушок на сметнічку } 2 р.
Зерняткі дзяўбецьь.

Чаму ж мне не пецьь,
Чаму ж не гудзецьь,
Сучачка на лычку } 2 р.
Хатку сцеражэцьь.

Дык чаму ж мне не пецьь,
Чаму ж не гудзецьь,
Калі ў маёй хатаньцы } 2 р.
Парадак ідзецьь?

## А МОЙ МІЛЫ ЗАХВАРЭЎ




А мой мілы захварэў,
Кіселіку захацеў.

Ох, ну, ды, ох, ну! *
Кіселіку захацеў.

Ой, цыц, мілы, не ўмірай,
Кіселіку дажыдай.

Пайшла баба па сялу
Даставаці кісялю.

Не дастала кісялю,
Ды дастала аўса.

---

* Прыпеў «Ох, ну, ды, ох, ну!» спяваецца ў кожнай страфе з паўторам другога радка тэксту.

Намачыла кісель
На дванаццаць нядзель.

На баране цадзіла,
А на лёдзе варыла.

Ды пакуль кісель паспеў,
Мой міленькі адубеў.

Як на покуці ляжаў,
Яшчэ было трошкі жаль.

Цераз сяло як вяла,
Яшчэ трошкі загула.

Як вывела за сяло,
Ужо стала весяло.

Ох, ну, ды, ох, ну!
Ужо стала весяло.

## А Ў ЦЁМНЫМ ЛЕСЕ САВА КУГІЧА




А ў цёмным лесе
Сава кугіча,
А ў чыстым полі
Муж жонку кліча.
Рана, рана
Муж жонку кліча.

— Ты жонка, Ганна,
Хлопцам падмана,
Хоць мужа маеш,
А ўсім маргаеш.
Мужа маеш,
А ўсім маргаеш.

— Ці, мой міленькі,
Я ў тым павінна,

Што за мной хлопцы,
Як за дзяўчынай.
Люлі, люлі,
Як за дзяўчынай.

— Ой, жонка, жонка,
Досыць ілгаці,
Бо я застаўлю
Праўду сказаці,
Бо застаўлю
Праўду сказаці.

— Калі, міленькі,
Ты мне не верыш,
Павесь званочак
На падалочак.
Люлі, люлі,
На падалочак.

Як хто затроніць,
Званок зазвоніць,
А ты пачуеш,—
Мяне ўратуеш.
Ты пачуеш —
Мяне ўратуеш.

Званочак звоніць
Ў садзе ля хаты,
А муж не чуе —
Ён глухаваты.
Муж не чуе —
Ён глухаваты.

## ЧАБАРОК




Чабарок, чабарок,
Ды каля дарожкі,
Харошанькі мой міленькі,
Ды крывыя ножкі.
Ох! Ох! Ды крывыя ножкі *.

---

* Апошні радок кожнай страфы паўтараецца з воклічам «Ох, ох!».

14 Зак. 998

А мой жа ты даўганосы,
Ой, які ж ты нехарошы:
Каб ты быў такі, як я,
Дык даўно была б твая.

Каля саду я хадзіла...
Ды шчыпала вішні,
Дай жа, божа, кавалера
Ды пад мае мыслі.

Каб і люльку не курыў,
Табакі не нюхаў,
Чужых жонак не любіў,
Адну мяне слухаў!

## ХАЦЕЛА Ж МЯНЕ МАЦІ ЗАМУЖ АДДАЦІ




Ой, хацела ж мяне маці
Ды за першага аддаць,
А той первы,
Первы няверны,—
Ой, не аддай мяне, мацъ!

Ой, хацела ж мяне маці
Ды за другога аддаць,
А той другі
Ходзіць да падругі,—
Ой, не аддай мяне, мацъ!

Ой, хацела ж мяне маці
Ды за трэцяга аддаць,
А той трэці,
Як у полі вецер,—
Ой, не аддай мяне, маць!

Ой, хацела ж мяне маці
За чацвёртага аддаць,
А той чацвёрты —
Ні жывы ні мёртвы,—
Ой, не аддай мяне, маць!

Ой, хацела ж мяне маці
Ды за пятага аддаць,
А той пяты —
П'яніца праклятьі,—
Ой, не аддай мяне, маць!

Ой, хацела ж мяне маці
Ды за шостага аддаць,
А той шосты —
Малы, недарослы,—
Ой, не аддай мяне, маць!

Ой, хацела ж мяне маці
Ды за сёмага аддаць,
А той сёмы —
Прыгожы ды вясёлы...
Ён не схацеў мяне ўзяць!

# ЯК ПАГНАЛА БАБУЛЕНЬКА КУРАНЯТАК ПАСЦІ



Захацела бабуленька
Разам збагацеці,
Пасадзіла курачку,
Каб вывела дзеці.
Ды нямнога, толькі трое,
Куранят прыждала;
Не паспелі з гнязда злезці,—
Пасвіць іх пагнала.

Як пагнала бабуленька
Куранятак пасці,
Сама села на пянёчку
Кудзелечку прасці.
Яшчэ нітак не ссучыла,
А ўжо двух згубіла,
Туды-сюды павярнулась
Ды на трэцяе спаткнулась.

— Ой, божа ж мой, божа,
А што ж мне рабіці?
Як прыедзе дзед із лесу,
Будзе мяне біці.
Бедна, бедна, бедна я.
Бедна галоўка мая,
Будзе мяне біці.

Як прыехаў дзед із лесу
Ды да сваёй хаты,
Пытаецца у бабулькі:
— А дзе ж куранаты?

Цып, цып, цып, цып, цып, цып,
цып!
Пуль, пуль, пуль, пуль, пуль,
пуль, пуль!
А дзе ж кураняты?

— Як не ведаў, дзеду,
Так не будзеш ведаць.
Вот садзіся лепш за стол —
Дам табе абедаць.
Хадзі, хадзі, мой дзядок,
Хадзі, хадзі, галубок,
Дам табе абедаць.

Разгневаўся дзедка,
Схапіў саламінку,
Пабіў бабцы, пахвастаў
Галаву і спінку.
Ой, ёй, ёй, ёй, ёй, ёй, ёй! } 2 р.
Галаву і спінку.

## КАСІЎ ЯСЬ КАНЮШЫНУ




Касіў Ясь канюшыну, (2 р.)
Касіў Ясь канюшыну,
Паглядаў на дзяўчыну.

А дзяўчына жыта жала, (2 р.)
А дзяўчына жыта жала
І на Яся паглядала.

— Ідзі, Ясь, да мяне, (2 р.)
Ідзі, Ясь, да мяне,
Спадабаўся ты мне.

Кінуў Яська касіць, (2 р.)
Кінуў Яська касіць,
Стаў ён мамку прасіць.

— Ці ты мамка, ці не, (2 р.)
Ці ты мамка, ці не —
Ажані ж ты мяне.

Усе людзі жонак маюць, (2 р.)
Усе людзі жонак маюць,
Абдымаюць і кахаюць.

Каб я жоначку меў, (2 р.)
Каб я жоначку меў,
То б не піў і не еў.

— Дык бяры Станіславу, (2 р.)
Дык бяры Станіславу,
Што, як сядзе,— на ўсю лаву.

Станіславы не хачу, (2 р.)
Станіславы не хачу,
Бо на лаву не ўссаджу.

— Дык бяры сабе Яніну, (2 р.)
Дык бяры сабе Яніну —
Працавітую дзяўчыну.

Што у полі жыта жала, (2 р.)
Што у полі жыта жала,
На цябе паглядала.

# А ТЫ ЕХАЎ




А ты ехаў, ехаў, ехаў,
Чаму ў сваты не заехаў?
Ў мяне брат, ў мяне тата, } 2 р.
А я дзеўка не занята.

Як ты ехаў, то я спала,
Як ты крыкнуў, то я ўстала,
Як ты свіснуў на каня — } 2 р.
Я галоўку падняла.

Сёння як былінка стала,
Тры дні хлеба ў рот не брала

І не піла кроплі воды —
Для тваёй усё выгоды. } 2 р.

А ты ехаў, ехаў, ехаў,
Чаму ў сваты не заехаў?
Ў мяне хата белая,
А я дзеўка смелая. } 2 р.

А ты ехаў, ехаў, ехаў,
Чаму ў сваты не заехаў?
Ў мяне гусь і цялушка,
А я дзеўка-весялушка. } 2 р.

Ты мінуў маю хаціну,
Да другой спяшаў дзяўчыны,
Хоць аб'едзь ты цэлы свет,
За мяне там лепшай нет! } 2 р.

# ПОЛЬКА-ЯНКА




Янка стаіць на гары,
А я стаю у даліне,
Янка сее кавуны,
А я журавіны.

Журавіны не ўзышлі,
Кавуны пасохлі,
Ка мне хлопцы не прыходзяць,
Каб яны падохлі.

Я на рэчцы хусткі мыла
Ды на плот павесіла,
Дзесяцёх ўсяго любіла,
Аднаго пацешыла:
Чаго, Янка, ты галосіш,—
Я цябе пацешу,
Ды пашыўшы зрэбну торбу,
На шыю павешу.

Свеціць ясна з неба зорка,
А дзе ж гэта мой Міколка?
Каля рэчкі грэбелька,
Дзе ж падзеўся Хведарка?
Паміж лесу прыгарок,
Дзе ж падзеўся Грыгарок?
Адцураліся, не йдуць:
Мусіць, мяне забудуць?

# ШУМНЫЯ БЯРОЗЫ

*Словы Я. Купалы*




Шумныя бярозы пабяліў мароз,
Хацеў бы я плакаць, ды не маю слёз.
Хацеў бы я пеці аб сваёй бядзе,
Ды мне сэрца ные, песенька не йдзе.

Хацеў бы, каб воля гуляла са мной,
Каб сонейка грэла, як грэе вясной.
Але, божа мілы, волі не відаць,
Кайданы няволі на руках звіняць.

Гэй, пайду я ў поле долечку шукаць
З востраю касою, як на сенажаць.
Ой, пайду я ў поле, як бы на вайну,
Шукаючы волю, шаблечкай махну.

# СОНЦА ЯСНАЕ НАМ СВЕЦІЦЬ




Сонца яснае нам свеціць,
Песня разліваецца,
Мой міленькі, даражэнькі
Ў армію збіраецца. } 2 р.

Заспявалі навабранцы
Песню маладзецкую:
Едуць, едуць не ў рэкруты,
Ў Армію Савецкую. } 2 р.

Рада маці, рад і татка:
На граніцу сын ідзе,—
Ды глядзі ж, сынок наш родны, } 2 р.
Стой там моцна, як нідзе.

Сонца яснае свяціла,
Песня разлівалася:
Са сваім мілым дружочкам } 2 р.
Ў той дзень развіталася.

15 Зак. 998

# ВЕЧАРКОМ ЗА РЭЧКАЮ




Вечарком за рэчкаю... Эх!
Вечарком за рэчкаю
Песенька гучыць.
Выйду я на ганачак, (2 р.)
Маці, не крычы,
Эх, ды, маці, не крычы.

Мілага, прыгожага... Эх!
Мілага, прыгожага

Ўспамінаю я,
Пра яго і складзена (2 р.)
Песенька мая,
Эх, ды песенька мая.

Дзяўчыну не кіне ён... Эх!
Дзяўчыну не кіне ён,
Хоць і сам не тут:
Ён паехаў восенню (2 р.)
Ў горад, ў інстытут,
Эх, ды ў горад, ў інстытут.

А учора з горада... Эх!
А учора з горада
Ліст ён мне прыслаў,
Што пры развітанні (2 р.)
Мілай абяцаў,
Эх, ды мілай абяцаў.

# ЦІ БАГАТ ТЫ, ЗЯЦЮХНА?




— Ці багат ты, зяцюхна,
Ці багат?
Колькі маеш конікаў,
Жарабят?

— Ой, багат я, цёшчухна,
Ой, багат.
Многа маю конікаў,
Жарабят.

— Колькі маеш, зяцюхна,
Мер аўса?
Ці шырока, зяцюхна,
Паласа?

— Многа маю, цёшчухна,
Мер аўса,
Шырока на ўсё поле
Паласа.

І збажына ў гумнах
І ў палёх —
Ўсё гэта калгаснае,
Ўсё маё!

## ЯК КРЫНІЦА ЦЯЧЭ




Як крыніца цячэ,
Наша ўлада расце —
Ўлада нашая
Ды савецкая. } 2 р.

І расце, і цвіце,
І жыццё нам дае —
Ды вясёлае,
Ды шчаслівае. } 2 р.

А хто шчасце нам даў,
Хто жыццё збудаваў?
Ўлада нашая
Ды савецкая. } 2 р.

# ЎЗЫШОЎ СВЕЦЕЛ МЕСЯЧЫК




Ўзышоў свецел месячык,
Ясная зара,
Асвяціў дарожаньку
Цёмнага сяла. } 2 р.

Была ж ты, дарожанька,
Непрыгляднаю,
Стала ж ты, дарожанька,
Ненагляднаю. } 2 р.

Шыроку дарожаньку
Ленін пратарыў,
Пракладку дарожанькі
Наш народ звяршыў. } 2 р.

Цяпер нам дарожанька
Вольная дана:
Працаваць машынамі,
Вадзіць трактара. } 2 р.

## ВІШАНЬКА




Чаму, вішанька, ты хілая была,
Што, чарэшанька, угору не расла, эх!
А сёлета буйным цветам зацвіла? (2 р.)

Як мне, вішаньцы, цвятамі не цвісці,
Як чарэшаньцы угору не расці? Эх!
Мне садоўнік палівае карані. (2 р.)

Чаму, дзевіца, не весела была,
Чаму, красная, на гульні не ішла, эх!
А сёлета ўсю брыгаду весяліш?

Як жа мне не быць вясёлай, маладой,
У калгасе я не знаюся з бядой. Эх!
Зарабіла я пяць соцень працадзён. (2 р.)

Я купіла плацці новенькія
Ды баціначкі шаўровенькія, эх!
Ёсць ў чым выйсці пагуляць, паплясаць (2 р.)

# НА КАЛГАСНЫ ЗАГОН МЫ ПАСЕЯЛІ ЛЁН




На калгасны загон  
Мы пасеялі лён. } 2 р.

Прыпеў:

Шаўкавісты, валакністы,  
Чысты лён. } 2 р.

Каб найлепшы сабраць,
Трэ палоць, даглядаць. } 2 р.

Прыпеў.

Трэба браць, трэба слаць,
Трэба мяць і трапаць. } 2 р.

Прыпеў.

Добрай пражы запас
Нашым фабрыкам даць. } 2 р.

Прыпеў.

# ПАДЗЯКА




Вясёлы лажуся, вясёлы ўстаю,
Ўжо сонейка свеціць у нашым краю.

Прыпеў:
Мы Партыі дзякуй сардэчнае шлём
За тое, што сёння свабодна жывём!

Бо Верасень месяц, семнаццаты дзень,
Ён зняў з нас навекі і смутак і цень.

Прыпеў.

Славамі не ў сілах я то апісаць,
Як нам цяпер міла «таварыш» сказаць!

Прыпеў.

# БАЛАДА АБ ПАРТЫЗАНЦЫ ГАЛІНЕ

*Словы Я. Купалы*




Над ракою ў спакою
Расцвітала каліна,
А ў сяле за ракою
Вырастала дзяўчына. } 2 р.

На каліну-маліну
Прылятала зязюля,
Да дзяўчыны Галіны
Прыглядаўся Януля. } 2 р.

За ракой, дзе Галіна,
Сенажаці касілі,
А ў сяле, дзе Януля,
У паход затрубілі. } 2 р.

Перастала каліна
У цвяточкі ўбірацца,
Перастала Галіна
З сваім мілым відацца. } 2 р.

Бедавала зязюля,
Што цвяточкаў не стала.
Бедавала матуля,
Што дзяўчына прапала. } 2 р.

Падняла восень хвалі
У рацэ пад калінай,
Пайшлі ў бой партызаны —
Там была і Галіна. } 2 р.

# ІЗ ДАЛЁКІХ ІЗ КРАЁЎ




Із далёкіх із краёў
Шлі салдацікі дамоў.
Эй, шлі салдацікі дамоў!

Па вузенькай дарожцы
Запыліла вочы ім.
Эй, запыліла вочы ім.

То пясочак, то не дым,
То Радзіма — не Берлін!
Эй, то Радзіма — не Берлін!

Вот і роднае сяло
На прыгорачку відно.
Эй, на прыгорачку відно!

16 Зак. 998

Выхадзіце, сёстры, брацця,
Пераможцаў сустракаці.
Эй, пераможцаў сустракаць!

Із далёкіх із краёў
Шлі салдацікі дамоў.
Эй, шлі салдацікі дамоў!

# ВЫБАРЧЫЯ ЧАСТУШКІ




Грай, гармонік, галасіста,
Рэж, баян, на ўсе басы:
За народных кандыдатаў
Аддадзім мы галасы.

Прыпеў:

Мы за ленінскую справу
Будзем цвёрда ўсе стаяць,
І за лепшых кандыдатаў
Пойдзем мы галасаваць.

Хутка прыйдзе наша свята,
Хутка прыйдзе слаўны дзень:
За народных кандыдатаў
Апушчу свой бюлетэнь.

Прыпеў.

Да цябе прыйшла, Валодзя,
Каб са святам прывітаць:
Сёння мы з табою пойдзем
У Саветы выбіраць.

Прыпеў.

Знаю важную навіну,
Няхай ведае ўвесь свет:
Трактарыстку Акуліну
Выбіраем у Савет.

Прыпеў.

Па-стаханаўску працуе
На заводзе дзед Ігнат,
За яго мы галасуем —
Будзе слаўны дэпутат.

Прыпеў.

Родны край свой аднаўляем
І жывём шчасліва зноў,

Мы ў Саветы выбіраем
Лепшых дочак і сыноў.

Прыпеў.

Грай, гармонік, галасіста,
Рэж, баян, на ўсе басы:
За народных кандыдатаў
Аддадзім мы галасы.

Прыпеў.

## ДЭПУТАТКА




Ёсць у нашым у калгасе
Ды дзяўчына слаўная,
Прыгажэй сваіх падружак
І ў рабоце спраўная. } 2 р.

Недарэмна на красуню
Хлопцы заглядаюцца,
А за што наша дзяўчына
Хлопцам падабаецца? } 2 р.

Ці за вочы, ці за бровы,
Ці за косы белыя,
Ці за подзвігі у працы,
Дзелавыя, смелыя. } 2 р.

Ці за ордэн, што на грудзях
Сонцам разгараецца,
Ці за тое, што героем
Яна называецца. } 2 р.

Нашы хлопцы у рабоце
Многа чаго вартыя,
Толькі цяжка параўняцца
З дзеўчынай упартаю. } 2 р.

За вялікую работу,
Шчырую, выдатную,
Выбіраюць дэпутаткай
Ды дзяўчыну знатную. } 2 р.

У Вярхоўным у Савеце,
З думамі свабоднымі,
Наша дзеўчына занята
Справамі народнымі. } 2 р.

І працоўным нашым людзям
Усё, што пажадаецца,
Па савецкаму закону
У жыцці збываецца. } 2 р.



## ЗМЕСТ

Песню бярыце з сабою! . . . . . . . 3

I

Дзяржаўны гімн Беларускай ССР . . . . . 7
Партыі слава. Словы А. Астапенкі, музыка І. Кузняцова . . . . . . . . . . . 10
Он родился весной. Слова А. Чепурова, музыка И. Лученка . . . . . . . . . . . 12
Радзіма мая дарагая. Словы А. Бачылы, музыка У. Алоўнікава . . . . . . . . . . 15
Славім мы свой край любімы. Словы П. Броўкі, музыка Ю. Семянякі . . . . . . . . 17
Ой, шумі ты, радуйся. Словы П. Броўкі, музыка

В. Яфімава . . . . . . . . . . . . 19
Нёман. Словы А. Астрэйкі, музыка Н. Сакалоўскага . . . . . . . . . . . . 21
Жураўлі на Палессе ляцяць. Словы А. Ставера, музыка І. Лучанка . . . . . . . . . 23
Песня о Минске. Слова И. Панкевича, музыка В. Оловникова . . . . . . . . . 26
Камсамольская песня. Словы А. Дзеружынскага, музыка Д. Камінскага . . . . . . . . 30
Лясная песня. Словы А. Русака, музыка У. Алоўнікава . . . . . . . . . . 32
Партызанскі край. Словы А. Дзеружынскага, музыка І. Кузняцова . . . . . . . . 34
Обелиски. Слова М. Ясеня, музыка Д. Смольского 36
Шагали солдаты. Слова С. Евсеевой, музыка Г. Вагнера . . . . . . . . . . . 40
Песня пра Заслонава. Словы А. Астрэйкі, музыка У. Алоўнікава . . . . . . . . . . 43
Над Прыпяццю. Словы А. Русака, музыка Я. Ціцоцкага . . . . . . . . . . . . 45
Узнялося сонца яснае. Словы А. Русака, музыка Д. Лукаса . . . . . . . . . . . 47
Радасць. Словы Я. Коласа, музыка А. Туранкова 50
Ой, шумят леса зеленые. Слова А. Ситковского, музыка Ю. Семеняко . . . . . . . . 54
Колас. Словы А. Ставера, музыка М. Чуркіна 56
Зубренок. Слова А. Миронова, музыка П. Подковырова . . . . . . . . . . . . 59
Вечарынка у калгасе. Словы Я. Купалы, музыка С. Палонскага . . . . . . . . . 62

Ходят песни над рекою. Слова В. Семакина, музыка И. Кузнецова . . . . . . . . . 65
Где-то в поселке. Слова К. Гляйхенгауса, музыка В. Оловникова . . . . . . . . . 67
Калгасны вальс. Словы А. Русака, музыка Г. Цітовіча . . . . . . . . . . . . 69
Ціхі вечар. Словы А. Русака, музыка Г. Вагнера 72
Пад цёмным ляском. Словы П. Глебкі, музыка А. Багатырова . . . . . . . . . . 74
Як у лесе зацвіталі. Словы Я. Купалы, музыка Р. Пукста . . . . . . . . . . . 77
Песня пра дзяўчыну Мальвіну. Словы Р. Сабаленкі, музыка М. Аладава . . . . . . 80
Ты мне вясною прыснілася. Словы М. Шушкевіча, музыка Ю. Семянякі . . . . . . 83
Толькі з табою. Словы А. Русака, музыка І. Любана . . . . . . . . . . . . . . 85
Чырвоная вяргінечка. Словы А. Русака, музыка Н. Сакалоўскага . . . . . . . . 87
Слуцкія ткачыхі. Словы М. Багдановіча, музыка М. Мацісона . . . . . . . . . . 89
Явар і каліна. Словы Я. Купалы, музыка Ю. Семянякі . . . . . . . . . . . . 91
Вясельная-застольная. Словы А. Русака, музыка І. Кузняцова . . . . . . . . . . 93
Дзе ты, зорка мая. Словы А. Русака, музыка І. Лучанка . . . . . . . . . . . . 95
Свіцязянка. Словы І. Скурко, музыка К. Цесакова 97
Песня бабыля. Словы народныя, музыка А. Туранкова . . . . . . . . . . . . 99

Яблонька. Слова А. Суркова, музыка Р. Бутвиловского . . . . . . . . . . . . 102
Бывайце здаровы! Словы А. Русака, музыка І. Любана . . . . . . . . . . . 104

## II

Мой край. Словы А. Русака, музыка Я. Ціхановіча . . . . . . . . . . . . 107
Прывітальная Маскве. Словы і музыка П. Шыдлоўскага . . . . . . . . . . . 109
Дума о Ленине. Слова Г. Регистана, музыка В. Горбатовского . . . . . . . 111
Наш Нёман. Словы Г. Цітовіча, музыка П. Шэўко 113
Родина. Слова А. Прокофьева, музыка Ю. Таленика . . . . . . . . . . . . 115
Палескія прасторы. Словы А. Дзеружынскага, музыка А. Граса . . . . . . . . 117
Марш камуністычных брыгад. Словы Ю. Доктарава, музыка В. Смірнова . . . . . . 119
Дубок. Словы М. Пянкрата, музыка П. Ахраменкі 122
Ураджайная святочная. Словы і музыка Р. Галавасцікава . . . . . . . . . . . 124
Песня аб Нарачы. Словы М. Танка, музыка М. Наско . . . . . . . . . . . 126
Речицкая лирическая. Слова М. Вишняка, музыка Н. Коньшина . . . . . . . . 128
Хорошо весною бродится. Слова М. Исаковского, музыка П. Косача . . . . . . . . 131
Купальская. Словы В. Лукшы, музыка У. Журо-

віча . . . . . . . . . . . . . . . . 133
Што ж ты мне сэрца параніў. Словы Н. Тарас, музыка І. Сушко . . . . . . . . . . . 135
Белы снег. Словы Л. Паўлені, музыка Я. Петрашэвіча . . . . . . . . . . . . 137
Ручнікі. Словы В. Вярбы, музыка М. Пятрэнкі . 139
Колькі ў небе зор! Словы і музыка А. Шыдлоўскага . . . . . . . . . . . 141
Вясельная. Словы М. Танка, музыка І. Маціна . 143
Мяцеліца. Словы А. Дзеружынскага, музыка М. Шуміліна . . . . . . . . . . 145

## III

Люблю наш край. Словы К. Буйло . . . . . 147
Жаваронačкі, прыляціце! . . . . . . . . 149
Спі, сыночак міленькі . . . . . . . . 151
Купалінка . . . . . . . . . . . . 153
Перапёлка . . . . . . . . . . . . 155
Салавейка, пташачка маленька . . . . . . 157
Ой, скарэй бы вячора даждаці . . . . . . 158
Прыйшоў на вяселле наш сваток . . . . . 159
Кума мая, кумачка . . . . . . . . . 160
Чачотачка . . . . . . . . . . . . 162
Да ў зялёнай дуброве . . . . . . . . 165
Вяне рута . . . . . . . . . . . . 167
Што за месяц, што за ясны? . . . . . . 169
Там каля млына . . . . . . . . . . 171
Зялёны дубочак . . . . . . . . . . 173
Забалела ды мая галованька . . . . . . 175

У полі бяроза . . . . . . . . . . . 177
Рэчанька . . . . . . . . . . . 179
А на дварэ дзень бяленькі . . . . . . 181
Зорка Венера. Словы М. Багдановіча . . . 182
Закацісь, яснае сонейка . . . . . . 184
Прыляцелі гусі . . . . . . . . . . 186
Ці свет, ці світае . . . . . . . . 188
Ой, развілася зялёна дубрава . . . . . 190
Кацілася чорна галка . . . . . . . . 192
Ці ўсе лугі пакошаны? . . . . . . . . 194
А ў полі вярба . . . . . . . . . . 196
Ай, зелена, зелена . . . . . . . . . 198
Як сарву я ружы кветку . . . . . . . 199
О, не кукуй, зязюленька, рана . . . . . 201
Чаму ж мне не пець? . . . . . . . . 203
А мой мілы захварэў . . . . . . . . 205
А ў цёмным лесе сава кугіча . . . . . 207
Чабарок . . . . . . . . . . . . 209
Хацела ж мяне маці замуж аддаці . . . . 211
Як пагнала бабуленька куранятак пасці . . 213
Касіў Ясь канюшыну . . . . . . . . 216
А ты ехаў . . . . . . . . . . . 218
Полька-Янка . . . . . . . . . . . 220
Шумныя бярозы. Словы Я. Купалы . . . . 222
Сонца яснае нам свеціць . . . . . . . 224
Вечарком за рэчкаю . . . . . . . . 226
Ці багат ты, зяцюхна? . . . . . . . . 228
Як крыніца цячэ . . . . . . . . . 230
Ўзышоў свецел месячык . . . . . . . 231
Вішанька . . . . . . . . . . . . 233

На калгасны загон мы пасеялі лён . . . . . 235
Падзяка . . . . . . . . . . . . 237
Балада аб партызанцы Галіне. Словы Я. Купалы 239
Із далёкіх із краёў . . . . . . . . 241
Выбарчыя частушкі . . . . . . . 243
Дэпутатка . . . . . . . . . . 246

На белорусском и русском языках

Песни родного края

Составители Г. Цитович и Л. Трасковская

Издательство «Беларусь» Государственного комитета Совета Министров Белорусской ССР по делам издательств, полиграфии и книжной торговли. Минск, Ленинский проспект, 79

Рэдактар Т. Дзядзюля. Мастак Ю. Кухар. Мастацкі рэдактар В. Бязмен. Тэхнічны рэдактар Л. Грамовіч. Карэктар Р. Маўшовіч.

Здадзена ў набор 8/VI 1972 г. Падпісана да друку 26/IX 1972 г. Тыраж 10 000 экз. Фармат $60 \times 90^1/_{32}$. Папера друк. № 1. Ум. друк. арк. 8. Уч.-выд. арк. 6,56. Зак. 998. Цана в коленкоре—68 коп.; в штапеле—87 коп.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Мінск, Ленінскі праспект, 79.

$\frac{9-4-6}{334-72}$

песні роднага краю

# песні роднага краю

87 к.



песні роднага краю



песні роднага краю

песні роднага краю

